

# «ВЫ МОЖАЦЕ СУР'ЁЗНА РАЗГАРНУЦЦА Ў БЕЛАРУСІ, НА НАШЫМ РЫНКУ»

**Акцэнты дзелавой праграмы Прэзідэнта ў Пекіне**

(Стар. 2–3)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

3 ВЕРАСНЯ 2025 г. СЕРАДА № 169 (30557)

# ВЫКЛАЛІСЯ НА ЎСЕ СТО

**Героі жніва з Баранавіцкага раёна аб рэкордах, планах і марах**





Хлебная ніва ў Беларусі ў асноўным убрана. У рэгіёнах напоўніцу рыхтуюцца да галоўнага свята хлебаробаў — «Дажынак». Знайшоўшы момант, калі ў перадавікоў жніва з'явілася крыху часу пагутарыць з журналістамі, карэспандэнты БелТА адправіліся ў адну з найлепшых гаспадарак Брэсцкай вобласці — ААТ «Крошын» Баранавіцкага раёна. Тут атрымалі шчодры ўраджай, своечасова і якасна ўбралі. Аб рэкордах, планах і любімай справе пагутарылі з героямі цяперашняй гарачай пары.

СТАР. 5

Фота БелТА.

ЯК КВІТНЕЕ БЕЛАРУСКАЯ СТАЛІЦА?

12



Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X

25169>

СУПРАЦОЎНІЦТВА

## ВЯЛІКІЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ ДЛЯ БІЗНЕСУ

**Віцебск прымае III Беларуска-ўзбекскі жаночы бізнес-форум**

Учора ў рамках візіту парламенцкай дэлегацыі Узбекістана ў нашу краіну бізнес-лэдзі, эксперты і лідары меркаванняў разгледзелі ў Віцебску шырокі спектр тэм. Асноўная — эканоміка: развіццё ўзаемадзеяння дзвюх краін у машынабудаванні, лёгкай прамысловасці, аграпрамысловым комплексе і турызме.



Фота БелТА.

СТАР. 7–8

# «ВЫ МОЖАЦЕ СУР'ЁЗНА РАЗГАРНУЦЦА Ў БЕЛАРУСІ, НА НАШЫМ РЫНКУ»

## Акцэнты дзелавой праграмы Прэзідэнта ў Пекіне

Візіт Прэзідэнта Беларусі Аляксандра ЛУКАШЭНКІ ў Кітай працягваецца. У аўторак беларускі лідар працаваў ужо ў Пекіне. Праграма насычаная, хоць некаторыя мерапрыемствы мелі закрыты характар. Новыя праекты, якія ўмацуюць беларуска-кітайскія адносіны і іх эканамічную аснову, кіраўнік дзяржавы абмеркаваў на сустрэчы з прадстаўнікамі кітайскіх бізнес-колаў.



### МЫ ЧАКАЕМ ВАС У БЕЛАРУСІ

Беларускі лідар сустрэўся з кіраўніцтвам кампаніі «Шаньдун Лісэнтэ Агратэхналоджы» на чале са старшынёй праўлення Ванам Шаўбо. Высокатэхналагічнае прадпрыемства спецыялізуецца на праектаванні, будаўніцтве і поўным абслугоўванні сучасных цяпліц. Кампанія пабудавала больш за 180 агароднінных баз і сучасных заводаў па вытворчасці расады ў 30 правінцыях і гарадах Кітая. Больш за 80 цяплічных комплексаў узведзены ў 40 краінах і рэгіёнах. Кампанія імкнецца актыўна ўдзельнічаць у глабальным працэсе мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі, прытрымліваючыся канцэпцыі ініцыятывы «Пояс і шлях».

«Вельмі прыемная сустрэча не толькі таму, што я маю нейкія адносіны да зямлі, але і таму, што, вывучыўшы вашы магчымасці, вы для нас вельмі цікавыя. І нават нягледзячы на тое, што сельская гаспадарка ў нас мае вельмі высокі ўзровень развіцця і многія прадукты харчавання мы пастаўляем у Кітай», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што гэта кампанія ўжо не навічок на рынку Беларусі, супрацоўнічае са Светлагорскім ЦКК. Летась паміж бакамі быў падпісаны кантракт на будаўніцтва цяпліцы 4-га пакалення для вырошчвання таматаў.

«Вы вельмі інтэнсіўна і актыўна супрацоўнічаеце з нашымі рэгіёнамі. У вас найноўшыя тэхналогіі, наколькі я валодаю сітуацыяй, па праектаванні, будаўніцтве і эксплуатацыі цяплічных комплексаў. Таму мы вас чакаем у Беларусі. Зямель і глебы, прыдатнай для цяпліц, у нас хапае. Калі вы выкарыстоўваеце штучнае арашэнне і падкормку раслін, мы крыху ўмеем гэта рабіць. Людзі, якія могуць працаваць на такіх комплексах, у Беларусі ёсць», — прапанаваў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы таксама звярнуў увагу на канкурэнтныя перавагі Беларусі для развіцця дзейнасці ў гэтым кірунку: «У нас прымальны кошт прыроднага газу, лішкі электраэнергіі (мы плануем пабудаваць другую атамную станцыю, мы яе абавязкова пабудуем). Таму вы можаце сур'ёзна разгарнуцца ў Беларусі, на нашым рынку. Што важна, мы вельмі шмат такой прадукцыі сёння прадаём у Расіі. Расійскі рынак неабсяжны. У Еўропе вельмі патрэбна гэта прадукцыя, таму калі хутка разгорнемся, мы можам атрымаць любую агародніну і прадаць на неабмежаваных рынках». Аляксандр Лукашэнка таксама прапанаваў у далейшым пастаўляць вырашчаную прадукцыю ў Кітай. «Я ведаю, што вы цяпер часткова гатовы інвеставаць у будаўніцтва цяплічных камбінатаў. Але я ўпэўнены, што літаральна праз год вы захочаце пабудаваць свае, кітайскія, са стапрацэнтным капіталам камбінаты для работы на тых рынках, — сказаў ён. — Словам, вы можаце разлічваць на падтрымку нашага ўрада ў Беларусі па вытворчасці агароднінnай прадукцыі ў закрытым грунце. Можаце для Кітая вырабляць. Вось колькі вырабіце, столькі і забераце ў Кітай».

### ВЫ САМЫЯ ЖАДАНЫЯ ГОСЦІ Ў БЕЛАРУСІ

Аляксандр Лукашэнка правёў таксама сустрэчу з кіраўніцтвам «Шаньдун Хуалян Грынхаус Інжынірынг» на чале з Чэнь Хунлянам. Гэта кампанія спецыялізуецца на вырошчванні кветак, уключаючы архідэі. «Вы, напэўна, самыя багатыя і самыя жаданыя госці будзеце ў Беларусі. Я маю на ўвазе тое, што мы адкуль толькі не завозім кветкавую прадукцыю, аж з Эквадора. Таму, спадар Чэнь, вам вароты адчынены. Рынак не асвоены — беларускі і расійскі, — ды і еўрапейскія рынкі. Канкурэнцыі практычна няма ніякай. Калі заўтра пачнеце прадаваць сваю цудоўную кветкавую прадукцыю, у тым ліку і архідэі, мы будзем вам вельмі ўдзячныя», — адзначыў беларускі лідар.

Плануецца, што ў Віцебскай вобласці з'явіцца сумеснае прадпрыемства па будаўніцтве цяплічных комплексаў 4-5-га пакаленняў агульнай плошчай не менш за

## У тэму

### Мы пачалі цыкл інвестыцыйных праектаў, якія зменяць тэхналагічную структуру краіны

Па выніках перагавораў **першы намеснік Прэм'ер-міністра Беларусі Мікалай СНАПКОЎ** расказаў журналістам пра тое, які эфект чакаецца ад сумеснага тэхналагічнага развіцця з Кітаем. Менавіта на гэтым краіны маюць намер зрабіць акцэнт у наступныя гады. Старт гэтаму працэсу далі лідары Беларусі і Кітая на праведзенай у Цяньцзіні сустрэчы, і работа ўжо запушчана. «Мы фактычна ўжо сёлета пачалі цыкл інвестыцыйных праектаў (не чакаючы 2026-2027 гадоў), якія, на мой погляд, праз 2-3, максімум 4 гады, цалкам зменяць тэхналагічную структуру нашай краіны», — сказаў першы віцэ-прэм'ер.

Мікалай Снапкоў звярнуў увагу, што вынік даюць і сустрэчы, якія Прэзідэнт праводзіў падчас візіту ў Кітай у пачатку чэрвеня. Шэраг падпісаных інвестыцыйных канкрэтных праектаў на агульную суму на дадзены момант каля 130 мільёнаў долараў. Але гэта сума не ўлічвае кошту тых тэхналогій, які Кітай перадае Беларусі, а выдаткі на іх распрацоўку вельмі высокія. «Напрыклад, адна з кампаній, з якой сёння падпісаны канкрэтны інвестыцыйны праект, траціць у год два мільярды долараў на НДВКР — навукова-даследчыя работы. Гэта, па вялікім рахунку, кажа аб узроўні канчатковага кошту падпісаных дакументаў», — падкрэсліў першы віцэ-прэм'ер.

Перш за ўсё гаворка ідзе аб тэхналогіях у машынабудаванні, аўтамабілебудаванні, у тым ліку і ў сельгасвытворчасці. У сваю чаргу **міністр прамысловасці Беларусі Андрэй КУЗНЯЦОЎ** заявіў аб зацікаўленасці машынабудаўнічага комплексу ў сучасных кітайскіх тэхналогіях. «Новыя тэхналогіі дапамогуць мець больш канкурэнтны прадукт, які будзе выпускаць наша краіна», — сказаў міністр. Ён адзначыў, што для абодвух бакоў гэта ўзаемавыгадныя адносіны, дзе кожны чэрпае тое, што трэба для дынамічнага развіцця.

### Юрый ЧАБАТАР: «Падпісаныя дакументы — аснова стратэгіі практычнага супрацоўніцтва Беларусі і Кітая ў сферах рэалізацыі інвестпраектаў і развіцця чалавечага капіталу»

Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнае агенцтва міжнароднага развіцця і супрацоўніцтва КНР зацвердзілі ўзаемныя планы супрацоўніцтва ў сферах рэалізацыі перспектыўных інвестыцыйных праектаў і развіцця чалавечага патэнцыялу, паведамілі ў Мінэканомікі.

Тут растлумачылі, што падпісанне стратэгічных двухбаковых дакументаў прымеркавана да афіцыйнага візіту Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі ў Кітайскую Народную Рэспубліку для ўдзелу ў Цяньцзінскім саміце ШАС і сустрэчы лідараў Беларусі і Кітая.

У прыватнасці, у дарожнай карце па супрацоўніцтве ў галіне развіцця на перыяд 2025—2030 гг. вызначаны план работы па падрыхтоўцы і рэалізацыі перспектыўных праектаў у галіне інфраструктурнага і сацыяльнага развіцця, стварэння сумесных вытворчасцяў і развіцця высокатэхналагічных галін. У дакуменце таксама зафіксаваны намеры па садзейнічанні прасоўвання ініцыятывы глабальнага развіцця, нарошчванні хуткасці рэалізацыі праектаў, накіраваных на сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі і павышэнне ўзроўню жыцця насельніцтва.

Мемарандум аб узаемаразуменні аб умацаванні супрацоўніцтва па развіцці чалавечага патэнцыялу прадугледжвае арганізацыю адукацыйных мерапрыемстваў для павышэння кваліфікацыі кадраў і абмену перадавым вопытам у сферах дзяржкіравання, лічбавай эканомікі, штучнага інтэлекту, сельскай гаспадаркі, аховы здароўя, індустрыяльных паркаў, прафесійнай адукацыі і іншых сфер.

10 га для вырошчвання кветак (ружы, хрызантэмы, архідэі і іншыя).

Прэзідэнт запэўніў, што з беларускага боку будзе аказана самае шырокае садзейнічанне: «Будзем падтрымліваць! Будзеце разгортваць вытворчасць па тых тэхналогіях, па якіх палічыце патрэбным».

Чэнь Хунлян падзякаваў беларускаму лідару за магчымасць сустрэцца, а таксама расказаў і аб пагадненні з Віцебскай вобласцю, распрацаваных адпаведных планах.

«У нас вельмі добрыя тэхналогіі, каб ажыццявіць наш агульны праект. Мы будзем прыкладаць агульныя намаганні, каб развіваць яго. У нас ёсць мноства сартоў розных кветак, так што мы б хацелі з вамі супрацоўнічаць па продажы гэтых кветак», — сказаў ён.

«Трэба прывозіць у Беларусь. І не толькі ў Беларусь. Мы з Беларусі будзем гандляваць і на Расію», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

## МЫ ГАТОВЫЯ БЫЦЬ ВАМ КАРЫСНЫМІ

У графік Прэзідэнта таксама была ўключана сустрэча з прадстаўнікамі буйной кітайскай аўтамабілебудаўнічай кампаніі, якая мела закрыты характар. Аднак па тых заявах беларускага лідара, што трапілі ў эфір, можна меркаваць, што на іх абмяркоўваліся перспектывы супрацоўніцтва ў прамысловасці, прамкааперацыі і, у прыватнасці, аб вытворчасці рухавікоў.

«Я, перш за ўсё, хачу вам падзякаваць за тое, што вы ў гэты няпросты для нас час, звязаны з рознага роду ціскам на Беларусь, вырашылі працаваць, актыўна працаваць, у Беларусі. Мы гэта бачым, мы гэта вельмі цэнім, — падкрэсліў беларускі лідар. — Мая галоўная задача сёння на сустрэчы з вамі — запэўніць вас у тым, што мы свята будзем выконваць узятыя на сябе абавязацельствы».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што прадукцыя, якую выпускае гэта кампанія, вельмі патрэбна Беларусі. «Мы ўмеем рабіць рухавікі. У вас кампанія вельмі прасунутая, гэта будзе вельмі добрая лінейка, якой мы, на жаль, у Беларусі не валодаем, але імкнёмся зрабіць. З вамі гэта будзе хутчэй. Усё гэта для нас сёння актуальна і патрэбна», — сказаў ён.



Кіраўнік кампаніі «Шаньдун Хуалян Грынхаус Інжынірынг» Чэнь Хунлянам.

Таксама кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на тое, што сёння вельмі важна рухацца ў краіны, якія развіваюцца ў Азіі і Афрыцы. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што краіны Афрыкі, якія вызваліліся ад каланіяльнага прыгнёту, хочуць мець раўнапраўныя адносіны з іншымі дзяржавамі. «Таму мы сваю прадукцыю гатовыя з вамі вырабляць і прадаваць на рынках, якія развіваюцца. Вы як чалавек практычны, разумееце, што мала вырабіць — зрабіць мы можам усё. А вось прадаць пры такой вострай канкурэнцыі... Мы гатовы быць вам карыснымі ў гэтым пытанні», — запэўніў кіраўнік дзяржавы.



Старшыня праўлення Ван Шаўбо кампаніі «Шаньдун Лісэнтэ Агратэхналаджы».

Яшчэ на адной сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі ішла размова аб аўтамабілебудаванні. «Ведаю, што вы праяўляеце пэўную цікавасць да работы ў Беларусі. Нам патрэбна ваша прадукцыя. Вы ведаеце, на што мы здольныя ў аўтамабілебудаванні», — сказаў ён. Па словах кіраўніка дзяржавы, беларускаму боку цікавы сумесная вытворчасць у аўтамабілебудаванні і продаж прадукцыі на рынках, якія блізкія да нашай краіны.

**Паводле прэс-службы Прэзідэнта.**
**Фота БелТА.**

# «РАСІЮ НАМ НІХТО НЕ ЗАМЕНІЦЬ»

**Прэзідэнты Беларусі і Расіі Аляксандр ЛУКАШЭНКА і Уладзімір ПУЦІН правялі сустрэчу ў Пекіне**

Сустрэча адбылася ў дзяржаўнай рэзідэнцыі «Дзяаюйтай», якая размешчана ў заходняй частцы Пекіна і мае больш як 800-гадовую гісторыю. Раней яна была загарадным палацам для адпачынку і забаў кітайскіх імператараў. Цяпер на тэрыторыі комплексу праводзяцца прыёмы, важныя мерапрыемствы міжнароднага маштабу, сустрэчы і перагаворы. Рэзідэнцыя таксама выкарыстоўваецца для размяшчэння высокіх замежных гасцей.




Уладзімір Пуцін адзначыў, што сустрэчы з Прэзідэнтам Беларусі дарма не праходзяць. Прэзідэнт Расіі абгрунтаваў гэта выказванне тым, што аб'ём тавараабароту паміж краінамі ўжо складае звыш 50 мільярдаў долараў і супастаўныя маштабы супрацоўніцтва ў Расіі — усяго з некалькімі краінамі.

Аляксандр Лукашэнка праінфармаваў Уладзіміра Пуціна аб сваіх сустрэчах на палях саміту ШАС. «Вы ж разумееце: Расію нам ніхто не заменіць, таму вельмі важна, што мы сёння сустракаемся», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

У сваю чаргу Уладзімір Пуцін заявіў: «І Беларусь ніхто не зможа замяніць для Расіі. У нас вельмі блізкія адносіны». Ён таксама адзначыў, што і ў асабістым плане адносіны паміж лідарамі краін добрыя, але важна тое, што вынік сумеснай работы — у наяўнасці з пункту гледжання эканамічнага росту і развіцця супрацоўніцтва. Ёсць шмат кірункаў у сферы кааперацыі, перш за ўсё ў прамысловасці.

«Працуем разам на ўсіх франтах, — пацвердзіў Аляксандр Лукашэнка. — Вы ведаеце. І будзем працаваць.

Мы, калі Прэзідэнт ЗША патэлефанаваў (тэлефонная размова Аляксандра Лукашэнкі і Дональда Трампа. — **«Зв.»**), абмяркоўвалі гэту праблему. Я яму сказаў: «Мы — адна краіна. У прынцыпе, Расія ў адзіночку ваюе. Мы як можам падтрымліваем і будзем падтрымліваць». Публічна аб гэтым гавару. Гэта бяда (маецца на ўвазе канфлікт ва Украіне. — **«Зв.»**). А хто мае рацыю, хто вінаваты — час пакажа. Яшчэ дзякуй скажуць многія-многія, асабліва ў Еўропе, што зноў у гэты складаны час нам даводзіцца спыняць нацызм, які мог перарасці ў фашызм. Таму, Уладзімір Уладзіміравіч, будзем разам да канца сваю ролю і функцыю выконваць».

Аляксандр Лукашэнка даў станоўчую ацэнку сустрэчы лідараў Расіі і ЗША, якая адбылася раней на Алясцы. «Я вас віншую: разам з Дональдам Трампам вы правялі добрую сустрэчу на Алясцы, — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. — Мы вам апладзіравалі вельмі. З двух бакоў (не трэба казаць «хтосьці выйграў, прайграў») удваіх вельмі выдатна спрацавалі. Я глядзеў па Украіне — крыць няма чым. Толькі крычаць там заходней ад нас: «Дрэнна, дрэнна!» Ім увесь час дрэнна. Я думаю, яны паразумнеюць і далучацца да ініцыятыў, якія вы абазначылі з Прэзідэнтам Злучаных Штатаў Амерыкі».

**Паводле БелТА.**

# КІТАЙ — САПРАЎДНЫ СЯБАР БЕЛАРУСІ

У Пекіне Прэзідэнт Беларусі Аляксандр ЛУКАШЭНКА сустрэўся з членам Пастаяннага камітэта Палітбюро ЦК Кампартыі Кітая, сакратаром Сакратарыята і кіраўніком канцылярыі ЦК КПК Цай Цы.

Кіраўнік дзяржавы назваў Кітай сапраўдным сябрам Беларусі. «За тры дзясяткі гадоў нашага супрацоўніцтва я не магу ўспомніць ніводнага выпадку, дзе б вы непаважліва неяк паставіліся да нашай краіны, дзе б вы не падтрымалі Беларусь, дзе б вы не адказалі дабром на нашы просьбы. Словам, вы сапраўдныя сябры», — адзначыў ён.

Аляксандр Лукашэнка выказаў спадзяванне, што вызначаны на яго сустрэчы са Старшынёй КНР Сі Цзіньпінам будучы напрамак беларуска-кітайскага супрацоўніцтва з акцэнтам на прамысловую кааперацыю прынясе вельмі добры плён і вынікі.

На сустрэчы з Цай Цы Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што звычайна на падобных мерапрыемствах пратакольна кажуць звычайныя рэчы з удзячнасцю за прыём, за тое, як абыходзяцца з госцем. «У сённяшнім выпадку, у дадзеным моманце, я хачу вам абсалютна шчыра (справа не ў дыпламатыі і зусім не ў тым, што трэба быць дыпламатычным), ад усёй душы падзякаваць за ўсё тое, што вы зрабілі, робіце для Беларусі наогул і падчас гэтага майго візіту і дэлегацыі. Вы як вялікая краіна, прадстаўнік вялікай цывілізацыі робіце няўяўнае для гасцей. Не толькі для мяне, а для ўсіх гасцей. А іх тут больш за тры дзясяткі. Вы робіце ўсё, каб яны паехалі з Кітая ў добрым настроі і назаўжды засталіся вашымі сябрамі», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Па яго словах, гэта важна для адносін паміж дзяржавамі. Але ў выпадку супрацоўніцтва з Беларуссю яшчэ важней іншае:

«Нам з вамі ўдалося выбудаваць грунтоўны падмурак нашых адносін. У нас трывалыя гандлёва-эканамічныя адносіны. У нас няма праблем у галіне палітыкі, дыпламатыі. Мы заўсёды і ўсюды падтрымліваем адзін аднаго на міжнародных пляцоўках. У нас усталяваліся самыя сяброўскія цесныя адносіны паміж кіраўнікамі краін».

У сваю чаргу Цай Цы падкрэсліў, што цяпер пад стратэгічным кіраўніцтвам лідараў дзвюх краін у кітайска-беларускіх адносінах усепагоднага ўсебаковага стратэгічнага партнёрства захоўваецца дынаміка імклівага развіцця: «Нашы адносіны, можна сказаць, уступілі ў перыяд найлепшага развіцця ў сваёй гісторыі». Ён адзначыў, што днямі адбылася змястоўная сустрэча Аляксандра Лукашэнкі і Сі Цзіньпіна, падчас якой быў дасягнуты цэлы шэраг дамоўленасцяў, намечаны новыя планы для далейшага развіцця кітайска-беларускіх адносін.

Цай Цы запэўніў у гатоўнасці кітайскага боку да сумеснай рэалізацыі ўсіх дасягнутых дамоўленасцяў, прасоўванні шматпланавага супрацоўніцтва і напаўненні двухбаковых адносін новым зместам. Ён таксама падзякаваў Аляксандру Лукашэнку за прынятае запрашэнне прысутнічаць 3 верасня ў Пекіне на ўрачыстасцях з нагоды 80-годдзя Перамогі над японскім мілітарызмам і заканчэння Другой сусветнай вайны.

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# СТРАТЭГІЧНЫЯ МЭТЫ АДНОЛЬКАВЫЯ

## Парламенцкая дэлегацыя Узбекістана прыбыла з візітам у Беларусь

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА і Старшыня Сената Олій Мажліса Танзіла НАРБАЕВА падпісалі пратакол да Мемарандума аб супрацоўніцтве (стварэнні Міжпарламенцкай камісіі) і план сумесных мерапрыемстваў (дарожную карту) на 2026—2027 гады.



Вітаючы ўзбекскіх калег, Наталля Качанава найперш павіншавала іх з Днём незалежнасці Рэспублікі Узбекістан, які адзначаўся напярэдадні III Беларуска-ўзбекскага жаночага бізнес-форуму. «Стала добрай традыцыяй праводзіць такія мерапрыемствы штогод ва Узбекістане і ў Беларусі, — адзначыла спікер. — Гэта важкі ўнёсак у супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі і народамі».

Старшыня Савета Рэспублікі засяродзіла ўвагу на тым, што Узбекістан заўжды быў для нас роднай краінай з брацкім народам. «Аб гэтым заўсёды гаворыць наш Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, — акцэнтавала ўвагу спікер. — І танальнасць у супрацоўніцтве задаюць лідары нашых дзяржаў. Сяброўства паміж нашымі народамі загартоўвалася ў полымі Вялікай Айчыннай вайны, і гэты факт набывае асаблівае гучанне ў 2025-м, калі адзначаецца 80-годдзе Вялікай Перамогі. Час, калі брацкія народы пляцо ў плячо абаранялі агульную Айчыну, — гэта скрэпы, фундамент, якія аб'ядноўваюць беларусаў і ўзбекаў на многія-многія гады».

Па словах Наталлі Качанавай, мерапрыемствы, што праводзяцца паміж дзвюма краінамі, сустрэчы на найвышэйшым узроўні, падпісанне дакументаў аб супрацоўніцтве садзейнічаюць развіццю адносін па розных кірунках.

**«У нас ёсць міжпарламенцкая група, а цяпер — першае пасяджэнне міжпарламенцкай камісіі, — канкрэтызавала спікер. — Эфектыўна працуе міжурадавая рабочая камісія. Паміж краінамі ёсць добрая нарматыўна-прававая база. Пастаўлена задача дасягнуць гадавога тавараабароту паміж нашымі краінамі ў 1 млрд долараў. На сёння ён складае больш за 600 млн долараў, але мы дасягнём зададзенай лічбы».**

З асаблівым гонарам Наталля Качанава паведаміла пра міжпарламенцкае ўзаемадзеянне ў рамках міжнароднага супрацоўніцтва, дзе Беларусь і Узбекістан падтрымліваюць адно аднаго. «Калі ў турбулентным свеце існуюць розныя плыні і нехта нават спрабуе ўмешвацца ва ўнутраныя справы краін, Беларусь і Узбекістан праводзяць сваю ўнутраную палітыку, якая перш за ўсё скіравана на ўмацаванне сяброўства з тымі краінамі, якія хочуць супрацоўнічаць, не пасягаючы на суверэнітэт іншых, — падкрэсліла яна. — Упэўненасць у падтрымцы калег унушае тое, што ў нашых дзяржаў аднолькавыя стратэгічныя мэты. Ва ўнутранай палітыцы — гэта паляпшэнне ўзроўню жыцця народа, яго дабрабыт, у знешняй — мір і згода».

Жаночы бізнес-форум робіць важкі ўнёсак ва ўмацаванне эканамічных сувязяў. Наталля Качанава выказала ўпэўненасць у тым, што дамоўленасці, дасягнутыя падчас гэтага мерапрыемства, будуць эфектыўна рэалізаваны.

Не змяншаючы значнасці эканамічных пагадненняў, кіраўнік Савета Рэспублікі нагадала пра важнасць гуманітарнага кірунку ўзаемадзеяння. Яна запэўніла гасцей у гатоўнасці да ўзаемадзеяння па любых вектарах і анансавала, што ў рамках форуму падпісваюцца пагадненні паміж жаночымі і маладзёжнымі арганізацыямі. Наталля Качанава нагадала, што ў навучальных установах Беларусі вучацца каля 4 тысяч маладых людзей з Узбекістана, і хутка адбудзецца вучэбны форум. Сёлета ва Узбекістане пройдуць Дні беларускай культуры.

**Святлана ЯКАЎЛЕВА.**
**Фота БелТА.**

*Працяг тэмы ў МС.*

МІЖНАРОДНЫ ВЕКТАР

# ПРЫЯРЫТЭТ — ПАШЫРЭННЮ БЕЛАРУСКА-В'ЕТНАМСКІХ СУВЯЗЯЎ

## Ігар СЕРГЯЕНКА прыняў удзел у парадзе з нагоды 80-годдзя Аўгустоўскай рэвалюцыі і Дня Незалежнасці В'етнама



Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста павіншаваў Генеральнага сакратара ЦК Камуністычнай партыі Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам То Лама і Прэзідэнта Лыонг Кыонга з 80-годдзем незалежнасці гэтай краіны. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што сувязі паміж Мінскам і Ханоем маюць даўнюю гісторыю і на працягу ўсёй гісторыі двухбаковых адносін Беларусь з захапленнем назірае за поспехамі В'етнама ў дасягненні амбіцыйных мэт палітычнага, эканамічнага і сацыяльнага развіцця. Умацаванне цесных сувязяў з В'етнамам як галоўным партнёрам у Паўднёва-Усходняй Азіі, па словах Прэзідэнта, з'яўляецца безумоўным прыярытэтам Беларусі.

Як вядома, па даручэнні кіраўніка дзяржавы, Старшыня Палаты прадстаўнікоў знаходзіцца з візітам у гэтай краіне. Спікер правёў шэраг перагавораў з кіраўніцтвам В'етнама, у рамках эканамічнага складніка праграмы наведаў правінцыю Лаакай, дзе адбылася цырымонія перадачы партыі кар'ерных самазвалаў БелАЗ, былі падпісаны двухбаковыя дакументы па рэалізацыі паставак беларускай і в'етнамскай прадукцыі.

На парадзе ў Ханоі, які стаў найбуйнейшым за апошнія дзесяцігоддзі, была прадэманстравана самая сучасная ваенная тэхніка, уключаючы танкі, ракеты, верталёты і рэактыўныя знішчальнікі. У калонах прайшлі тысячы в'етнамскіх салдат, а таксама ваеннаслужачыя Кітая, Расіі, іншых краін. В'етнамскі флот прайшоў строем у глыбакаводным заліве Камрань.

Парад адбыўся на плошчы Бадзінь, дзе 2 верасня 1945 года першы Прэзідэнт В'етнама Хо Шы Мін абвясціў гістарычную дэкларацыю незалежнасці. Тады ж было аб'яўлена аб поспеху Аўгустоўскай рэвалюцыі, вызваленні ад японскай акупацыі і амаль стагадовага каланіяльнага панавання Францыі, а таксама аб стварэнні дэмакратычнай рэспублікі.

**Ігар Сергяенка павіншаваў Старшыню Нацыянальнага сходу В'етнама Чан Тхань Мана з гэтымі важнымі датамі і адзначыў, што парламентарыі Рэспублікі Беларусь надаюць вялікае значэнне пашырэнню ўсяго комплексу беларуска-в'етнамскіх сувязяў, а таксама канструктыўнаму ўзаемадзеянню ў рамках міжнародных арганізацый.**

Спікер выказаў спадзяванне, што пры падтрымцы в'етнамскіх калег дыялог заканадаўчых органаў будзе актыўна развівацца і садзейнічаць умацаванню дружалюбных адносін паміж дзяржавамі.

Ад імя дэпутатаў Старшыня Палаты прадстаўнікоў усклаў вянок да маўзалея Хо Шы Міна ў Ханоі. Маўзалей, які, дарэчы, спраектаваны і пабудаваны пры садзейнічанні савецкіх спецыялістаў, уяўляе сабой двухпавярховы будынак з шэрага мармуру, на другім паверсе якога знаходзіцца празрысты саркафаг з целам першага Прэзідэнта В'етнама. Пры ўваходзе ў маўзалей на мармуровай пліце выбіта яго знакамітая фраза: «Няма нічога даражэйшага за незалежнасць і свабоду».

**Паводле прэс-службы Палаты прадстаўнікоў.**
**Фота ТГ-канала Палаты прадстаўнікоў.**

8 верасня 2025 года Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар Сергяенка правядзе асабісты прыём грамадзян і прадстаўнікоў юрыдычных асоб у Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Пачатак — у 14.30.

Папярэдні запіс на асабісты прыём ажыццяўляецца з 2 да 4 верасня 2025 года з 8.00 да 13.00 і з 14.00 да 17.00 па тэлефоне (8-017) 222-69-25.

# ВЫКЛАЛІСЯ НА ЎСЕ СТО


Ігар ГАЎРЫК.

## РАБОТА КІПІЦЬ КРУГЛЫ ГОД

З **камбайнерам Ігарам ГАЎРЫКАМ** сустракаемся на мехдвары. Свой GS-2124 ён ласкава заве «працавіком». На ім намалаціў больш за 5 тысяч тон збожжа. Механізатар прызнаецца, што работа ў гаспадарцы кіпіць круглы год. Зімой ён даводзіць да розуму тэхніку, рыхтуючыся да палявых работ, вясной уключаецца ў пасяўную. Уносіць мінеральныя ўгнаенні пад ярывую сяўбу, падкормлівае азімыя. На самаходным апырскавальніку праводзіць хімпраполкі.

Падчас жніва Ігар у полі зранку і дацямна. «Настройваешся на інтэнсіўную работу. Трэба выкласціся на 100 працэнтаў, бо шмат працы ўкладзена ва ўраджай», — адзначае камбайнер.

Дома з разуменнем ставяцца да такога рытму. Камбайнер — з сямейнай дынастыі хлебаробаў. Пайшоў па шляху бацькі. У гаспадарцы працавалі і бабуля, і дзядуля. Жонка — аграном. Выхоўваюць 12-гадовую Варвару, хлопчыкаў Макара і Елісея: аднаму ў лістападзе будзе 11 гадоў, другому споўнілася 3 гады. Дзеці ганарацца бацькам, калі бачаць, якой махінай ён кіруе. Сын загарэўся ідэяй таксама стаць камбайнерам.

Ігар атрымаў спецыяльнасць аграноама, скончыў Ляхавіцкі дзяржаўны аграрны каледж, завочна — Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт. Працаваў па спецыяльнасці, а потым вырашыў, што тэхніка яму бліжэй. Старшым камбайнерам працуе 15-ы сезон, да гэтага шмат гадоў быў памочнікам, у тым ліку тры гады ўбіраў хлеб разам з бацькам.

Ігара Гаўрыка неаднойчы прызнавалі адным з найлепшых на рэспубліканскіх (у складзе маладзёжных экіпажаў), абласных «Дажынках». У гаспадарцы ён на добрым рахунку: адказны, заўсёды можна на яго разлічваць. У мінулым сезоне атрымаў новы камбайн.

«На старым камбайне адпрацаваў 13 сезонаў. Было шкада аддаваць, але захацеў больш магутны. Летась больш як 5 тысяч намалаціў, сёлета таксама. Яшчэ кукурузу на ім трэба будзе ўбраць», — адзначыў механізатар.

Захапленне тэхнікай у яго з дзяцінства. Аб сабе кажа так: «Дзе нарадзіўся, там і спатрэбіўся». Сакрэтам поспеху называе любоў да сваёй справы, цярпенне. Высокая канкурэнцыя і годная ўзнагарода таксама матывуюць.

На вынік працуе дружная каманда прафесіяналаў. Аператыўна арганізаваны адвоз збожжа. У тандэме з Ігарам памочнікам камбайнера ў гэтым сезоне працаваў студэнт Аляксей Малейка. Пасля ВНУ ён прыйдзе ў «Крошын» па размеркаванні. На камбайне была яго першая гарачая пара, да гэтага ў складзе студатрада працаваў на зернесушыльным комплексе.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## МАРА ДЗЯЦІНСТВА — СУСТРЭЦЦА З ПРЭЗІДЭНТАМ

**Перадавіком у перавозцы ўраджаю** стаў **Вячаслаў ТРУС.** На яго рахунку каля 8,9 тысяч тон дастаўленага збожжа. Вадзіцель пабіў свой леташні максімум — амаль 7,5 тыс. тон.

«У наступным годзе будзем спрабаваць узяць планку 9 тысяч тон, калі вырасце дастойны ўраджай», — падзяліўся планамі Вячаслаў.


Вячаслаў ТРУС.

У жніве ён бярэ ўдзел з 2009 года. Яшчэ калі вучыўся ў Жыровіцкім дзяржаўным аграрна-тэхнічным каледжы, працаваў памочнікам камбайнера. Па размеркаванні трапіў у гаспадарку, спрабаваў руліць камбайнам, але выбраў іншы кірунак.

МАЗ, на якім перавёз рэкордныя амаль 9 тысяч тон, атрымаў у жніўні 2023 года. З тэхнікай на «ты» Вячаслаў з малых гадоў. Бацька, дзядзька працавалі кіроўцамі. Жыццё на сяле вадзіцелю па душы. «Горад — не маё. У вёсцы весялей. Для ўборачнай надвор'е сёлета неспрыяльнае — не давала нармальна ўвайсці ў тэмп. Калі ўвайшлі ў каляіну, ужо было позна. І цяжка: стомленасць давала аб сабе знаць. Ужо з 3 тысяч тон адлічваў, калі ж фініш!» — падзяліўся эмоцыямі аграрый.

Вячаслаў пакуль не жанаты. Сваю прафесію любіць, гаворыць, што праца для яго — хобі. У вольны час можа скласці кампанію калегам-рыбакам, але ў цэлым рыбалка не моцна прыцягвае. Ёсць мара дзяцінства — сустрэцца з Прэзідэнтам краіны.

## АСАБІСТЫ РЭКОРД

Яшчэ аднаго **камбайнера-перадавіка Аляксандра ЯРАША** заспелі ў полі, дзе ён працаваў на прасаванні саломы.

«Уборачная на новым камбайне GS-2124 прайшла добра. Намалацілі амаль 4,5 тысячы тон. Нядрэнны вынік. Мой мінулы рэкорд — 2,5 тысячы. Буду імкнуцца, каб больш было», — расказаў Аляксандр.

Для яго, як камбайнера, гэта трэцяе жніво. Яшчэ два сезоны працаваў памочнікам. На колькіх палях працаваў, ужо і не палічыць. «Далі заданне — трэба выканаць без страт. Галоўнае — не нервавацца, працаваць на пазітыве. І будзе ўсё добра», — упэўнены Аляксандр.

Сам ён жыве ў Баранавічах. Яшчэ ў школе вызначыўся, што будзе аграрыем. «Дзед быў трактарыстам, перадавіком. З ім пастаянна катаўся. Мне гэта падабаецца. Адвучыўся — і адразу за руль трактара, камбайна. Ніякіх складанасцяў. Сучасная тэхніка дазваляе хутка ўбіраць. Гэта раней малацілі 300 тон і станавіліся перадавікамі. Цяпер амаль столькі за дзень атрымліваем. Камбайны намнога сталі лепш», — падзяліўся ён.

Сёлета дапамагаў на ўборцы **дырэктар Мірнаўскай сярэдняй школы Аляксей ЖДАНОВІЧ.** «Спрацаваліся. У наступным годзе зноў будзем разам працаваць», — расказаў Аляксандр.

Апора і падтрымка для Аляксандра — сям'я. Камбайнер выхоўвае дачок Веру і Варвару: малодшай — 7 гадоў, старэйшай — 12. Дзяўчаты любяць бавіць час, катаючыся на веласіпедах. Падабаюцца ім таксама танцы, лёгкая атлетыка. Малодшая яшчэ хоча займацца каратэ.

Сам Аляксандр адным са сваіх захапленняў назваў байдаркі. «Хадзілі сёлета некалькі разоў. Спадабалася», — расказаў камбайнер. Таксама з сям'ёй імкнецца ў вольны час выбірацца на прагулкі, бываюць на «Белагра».

Аляксандр два сезоны ў Брэсцкай вобласці займаў на ўборачнай першыя месцы ў складзе маладзёжнага экіпажа.

«Матывуюць азарт і, вядома, зарплата. Чым больш намалаціў, тым больш атрымаеш», — адзначыў камбайнер.

**Надзея МАТВЕЕВА.**
**Фота Сяргея ШЭЛЕГА, БелТА.**



## НА 1 ВЕРАСНЯ БЕЛАРУСКІЯ АГРАРЫІ НАМАЛАЦІЛІ БОЛЬШ ЗА 8,735 МЛН ТОН ЗБОЖЖА РАЗАМ З РАПСАМ







Збожжавыя і зернебабовыя культуры без кукурузы ўбраны з 95 % плошчаў, што складае 2,294 млн га




Вытэрэблена лёну на 46 тыс. га, што складае 96 % запланаваных плошчаў




Пасеяна азімых збожжавых на зерне на плошчы 11 тыс. га, або 1 % запланаванага




Бульбы ў краіне накапана ўжо больш за 54 тыс. т. Сярэдняя ўраджайнасць вышэйшая за леташнюю на 57,3 ц/га

### Тым часам

**У гаспадарках і арганізацыях краіны актыўна ідзе ўборка цукровых буракоў — адной з ключавых тэхнічных культур.**

**Уборачная кампанія праходзіць у Брэсцкай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай абласцях, якія ствараюць надзейную сыравінную базу для цукровай галіны краіны.**

**Аграрыям сёлета трэба ўбраць ураджай з плошчы 107 тыс. га. Паводле даных на 2 жніўня, ужо ўбрана 6 % пасяўных плошчаў, або 6 тыс. га. Валавы збор цукровых буракоў перасягнуў 304 тыс. тон.**

**Сярэдняя ўраджайнасць культуры значна перавышае паказчыкі мінулага года і складае 476 ц/га, што на 57,7 ц/га вышэй за ўзровень мінулага года.**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | | |
|---|---|---|
| **Организатор электронных торгов** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390. Тел. +375 17 310-36-37 | |
| **Продавец** | Минский вагонный участок УП «Минское отделение Белорусской железной дороги», Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, д. Богатырево, д. 49/4, станция, УНП 100016951 | |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by | |
| **Предмет электронных торгов** | | |
| Лот № | Наименование (модель) | Начальная цена с НДС, бел. руб. |
| **Пассажирские вагоны с тележкой узкой и широкой колеи** | | |
| 1 | РИЦ №013-02363 МОДЕЛЬ 3.572 | 1 404 000,00 |
| 2 | РИЦ №013-02371 МОДЕЛЬ 3.572 | 1 404 000,00 |
| 3 | РИЦ №013-02389 МОДЕЛЬ 3.572 | 1 404 000,00 |
| 4 | РИЦ №013-02397 МОДЕЛЬ 3.572 | 1 716 000,00 |
| **Пассажирские вагоны без тележки узкой колеи** | | |
| 5 | РИЦ ТИП Z1 №013-02439 МОД. 305Ad2 (ВЛАБ РИЦ) | 2 940 000,00 |
| 6 | РИЦ ТИП Z1 №013-02447 МОД. 305Ad2 (ВЛАБ РИЦ) | 2 940 000,00 |
| 7 | **Тележки вагонные GP-200N ВЛАБ РИЦ-200** (4 шт.) | 134 400,00 |
| **Шаг торгов – 5 % от начальной цены** | | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 11.10 03.10.2025**. **Дата и время окончания приема заявок:** на ЭТП «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by) по **02.10.2025 до 17.00** | | |
| Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайте Госкомимущества | | |
| **Контактные телефоны**: +375 (17) 310-36-37, +375 (29) 154-34-35. **E-mail:** auction@cpo.by | | |

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by** |
| **Продавец** | |
| **№ 1 – ЗАО «Доброном», УНП 191178504 (доля 5,22 %), № 2 – ЗАО «Консул», УНП 200534611 (доля 1,79 %), № 3 – ООО «Тибетрэй», УНП 101472823 (доля 0,28 %), № 4 – ОАО «Дяковичи», УНП 491084703 (89,41 %), № 5 – ОДО «Мостра-групп», УНП 101228755 (доля 3,30 %)** | |
| **Предмет электронного аукциона** | |
| **Мелкооптовый магазин** (Здание специализированное розничной торговли), инв. № 110/С-90908, общ. пл. 559,9 кв. м, по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Наконечникова, 2. Составные части и принадлежности: Двухэтажное кирпичное здание магазина с кирпичным подвалом | |
| **Сведения о земельном участке с кадастровым номером 141000000003002783:** общ. пл. 0,1442 га предоставлен продавцу для обслуживания магазина мелкооптовой торговли на праве аренды по 09.12.2039 | |
| **Начальная цена лота, с НДС 20 % – 257 804,96 бел. руб. (снижена на 50 %)** | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены лота в белорусских рублях перечисляется на расчетный счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X. Получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191 224 638 | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после электронных торгов. Продавцы составляют и направляют договор для подписания победителю аукциона |
| **Срок оплаты предмета электронных торгов** | **30 (тридцать) календарных дней** после электронных торгов |
| **Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **4 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов | |
| Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия | |
| Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 15.07.2025 г. | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **16.09.2025 г. с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **15.09.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-373-21-33, +375 44 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

Первичная профсоюзная организация общества с ограниченной ответственностью «ДОМИНВЕСТПРО» Белорусского профессионального союза работников строительства и промышленности строительных материалов ликвидируется в связи с ликвидацией общества с ограниченной ответственностью «ДОМИНВЕСТПРО».

Требования кредиторов могут быть заявлены в течение 2 месяцев с момента опубликования настоящего сообщения по адресу: 222310, г. Молодечно, ул. Вередовская, д. 8, пом. 1.

УНП 100799172

Утерянное свидетельство о государственной регистрации Индивидуального предпринимателя на имя ИВИЦКОЙ Ольги Владимировны, УНП 790412939 **считать недействительным**


# «ПРЫБРАЛІ АМАЛЬ 900 ТЫСЯЧ КУБАМЕТРАЎ ДРАЎНІНЫ»

## У Мінлясгасе расказалі аб выкананні даручэння Прэзідэнта

Да 1 верасня перад галіной стаяла задача прыбраць склады з драўнінай уздоўж сельгаспалёў і на ўзлесках. Толькі арганізацыям сістэмы Мінлясгаса трэба было вывезці без малога 900 тысяч кубаметраў драўніны, нагадалі ў профільным ведамстве.



— З гэтай задачай мы справіліся на даступных участках, — канстатаваў у інтэрв'ю «Першаму інфармацыйнаму тэлеканалу» **начальнік упраўлення вытворчасці і рэалізацыі прадукцыі Мінлясгаса Андрэй МАЦКЕВІЧ**.

Кіраўнік структурнага падраздзялення Мінлясгаса падкрэсліў: складваць драўніну на ўзлесках лясгасы ў многіх выпадках прымусіла спецыфіка тэхналогіі нарыхтоўкі бураломнай драўніны і адсутнасць іншых свабодных месцаў складавання. Каб паскорыць вывазку складоў, гэта драўніна рэалізоўвалася ў першачарговым парадку.

— У асноўным гэта праблема закранула Гомельскую і Магілёўскую вобласці, якія найбольш моцна пацярпелі ў выніку ўтварэння бураломаў, — расказаў Андрэй Мацкевіч.

Начальнік упраўлення таксама дадаў, што па даручэнні міністра лясной гаспадаркі да 10 верасня будзе завершана даачыстка прыбраных раней складоў.

# ТРЭНД НА РАЗВІЦЦЁ

## Кіраўнікі прадпрыемстваў плануюць рост аб'ёмаў вытворчасці і павышэнне попыту на сваю прадукцыю




Пра гэта сведчаць вынікі кан'юнктурнага апытання, праведзенага ў жніўні НДЭІ Мінэканомікі, паведамілі ў прэс-службе эканамічнага ведамства.

У прыватнасці, аб станоўчай дынаміцы выпуску альбо захаванні яго ўзроўню паведамілі 66 % топ-менеджараў, тры чвэрці апытаных канстатавалі рост альбо захаванне попыту на сваю прадукцыю.

Застаецца на ранейшым узроўні каэфіцыент загрузкі вытворчых магутнасцяў у сярэднім па прамысловасці (69 %) і сярэдні перыяд забяспечанасці прадпрыемстваў замовамі (тры месяцы).

Таксама ў жніўні актывізавалася скарачэнне запасаў гатовай прадукцыі. Доля адказаў аб іх зніжэнні склала 38 %.

— Вынікі апытання сведчаць аб устойлівым трэндзе на актыўнае інвеставанне прадпрыемствамі ў сваё развіццё: яго рост у найбліжэйшыя тры месяцы плануе кожны чацвёрты кіраўнік, — растлумачылі ў Мінэканомікі.

Тут дадалі, што сярод кірункаў выкарыстання капіталу лідзіруюць абнаўленне (75 %) і пашырэнне (34 %) вытворчых магутнасцяў. Для 22 % прамысловых прадпрыемстваў значным было пытанне інвеставання ў рэсурсазберажэнне. У зніжэнне працоўных выдаткаў укладвалі 18 % кампаній.

— Прагнозная ацэнка змены агульнага эканамічнага становішча на найбліжэйшы месяц застаецца пазітыўнай, — запэўнілі ў эканамічным ведамстве. — Большасць кіраўнікоў чакае павелічэння альбо захавання попыту на прадукцыю, якая выпускаецца (89 %), і аб'ёмаў яе вытворчасці (84 %), трэць рэспандэнтаў — рост прыбытку.

# ГРОШЫ НЕ ПАХНУЦЬ. А ЧЫМ ПАХНЕ СТРАХОЎКА?

## Адказ на гэта пытанне далі ў Міністэрстве па падатках і зборах



Тут растлумачылі, што падатковымі органамі праводзіцца пастаянная работа па выяўленні і спыненні парушэнняў у розных сферах прадпрымальніцтва, няхай і вельмі спецыфічных. Адно з самых дзіўных спалучэнняў «два ў адным» у нядаўнім мінулым — бізнес-сеткі платных туалетаў і пасрэдніцкая дзейнасць. І, як высветлілася, абодва — «афшор» па падатках.

Так, у Брэсцкай вобласці падатковымі органамі ў ходзе аператыўных мерапрыемстваў выяўлены факты ўтойвання наяўнай выручкі пры аказанні паслуг платных туалетаў. Сума схаванай ад падаткаабкладання наяўнай выручкі перавысіла 150 тысяч рублёў, а таксама ўстаноўлены факты яе выкарыстання на выплату заработнай платы «ў канвертах». Пад дэвізам «грошы не пахнуць» гэтым жа суб'ектам быў арганізаваны бізнес па абавязковым страхаванні грамадзянскай адказнасці ўладальнікаў транспартных сродкаў, якія выязджаюць у краіны Еўрасаюза, ад імя страхавой арганізацыі, створанай за межамі Беларусі. Толькі плацельшчык не ўлічыў, што ў адпаведнасці з Законам «Аб страхавой дзейнасці» такая пасрэдніцкая дзейнасць з'яўляецца незаконнай і забараняецца. Даход ад рэалізацыі страхавых полісаў склаў больш за 200 тысяч рублёў.

Як паведамілі ў профільным міністэрстве, суб'ект гаспадарання і 6 яго касіраў прыцягнутыя да адміністрацыйнай адказнасці ў выглядзе штрафаў за парушэнні парадку прыёму наяўных грашовых сродкаў. Распачаты адміністрацыйны працэс за ажыццяўленне забароненай прадпрымальніцкай дзейнасці, за што суб'екту пагражае штраф у памеры да пяцісот базавых велічынь і канфіскацыя да 100 % сумы даходу, атрыманага ў выніку забароненай дзейнасці.

— Прыцягненне да адміністрацыйнай адказнасці не вызваляе ад выплаты падаткаў у дачыненні да ўтоенай выручкі, у тым ліку з выплачанай заработнай платы «ў канвертах», — дадалі ў падатковым ведамстве.

Мясцовае Самакіраванне
Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
3 верасня 2025 г. № 32 (813)

# ВЯЛІКІЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ ДЛЯ БІЗНЕСУ

*(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)*

— Акруга сапраўды ўнікальная, разнастайная, вялікая. І мне цікава адкрываць яе для сябе, адкрываць людзей, якія жывуць у маленькай вёсачцы і ў вялікім горадзе. Гэта зусім розныя людзі, але да кожнага з іх можна знайсці падыход, калі быць з імі разам, калі размаўляць адкрыта, шчыра цікавіцца іх турботамі. Быць бліжэй да людзей — не прыгожыя словы, а неабходнасць для дэпутата. Людзям важна бачыць цікавасць да сваёй працы, адчуваць, што іх меркаванне мае значэнне. Прыязджаю ў вёсачку, дзе жывуць 10 чалавек, і адчуваю, што месцічам трэба паразмаўляць на глабальныя тэмы, падзяліцца сваімі навінамі. Яны не саромеюцца расказваць пра свае праблемы. Магчыма, некаторыя з іх і не маюць прамога дачынення непасрэдна да дэпутацкай дзейнасці, але выбаршчыкі бачаць у сваім дэпутаце своеасаблівы масток да ўлады. Значыць, трэба апраўдваць іх давер.

***— Напэўна, прыём грамадзян у акрузе праходзіць насычана?***

— Я вельмі не люблю даваць пустых абяцанняў. Адзін раз паабяцаеш і не выканаеш — страціш давер. Таму імкнуся праводзіць прыём грамадзян разам з прадстаўнікамі арганізацый, якія павінны вырашаць пытанні людзей. Выслухалі, прааналізавалі, вырашылі, як дапамагчы — хутка і кампетэнтна. Ёсць пытанні, якія не вырашаюцца адразу. І тады трэба растлумачыць чалавеку, чаму трэба пачакаць, расказаць, якія меры будуць прынятыя. Галоўнае, каб ён бачыў, што працэс вырашэння праблемы распачаты. Напрыклад, у Ельскім раёне ёсць праблема з якасцю пітной вады. Людзі часта падымаюць гэта пытанне, але яно не вырашаецца за адзін дзень. Я трымаю праблему на кантролі, на кожнай сустрэчы з выбаршчыкамі расказваю, што ўжо зроблена: выканана прамыўка труб, адрамантаваныя два фільтры, заменены ўчастак водаправоднай сеткі і гэтак далей. І людзі разумеюць, што трэба толькі пачакаць. Нярэдка ў жыхароў ёсць сваё бачанне вырашэння праблемы. І тады даводзіцца тлумачыць, чаму па законе трэба дзейнічаць менавіта так. Калі вырашыць праблему немагчыма, я кажу пра гэта шчыра.

***— Ала Валер'еўна, падзяліцеся назіраннямі, чым адметныя палешукі?***

— Яны абсалютна неабыякавыя да месца, дзе жывуць. Яны безумоўна любяць сваю зямлю і хочуць зрабіць яе больш утульнай, зручнай, прыгожай, і неабыякавасць — гэта самае галоўнае. Самае прыемнае, што неабыякавасць — галоўная рыса і ў прадстаўнікоў мясцовай улады, кіраўнікоў арганізацый, якія працуюць на карысць свайго края. Калі ў 2023 годзе ў Мазыры на рамонт быў закрыты мост праз Прыпяць, у жыхароў горада было шмат пытанняў. Значна змяніліся маршруты грамадскага транспарту, было шмат праблем з лагістыкай — зламаўся лад жыцця, які ўстаяўся, ад людзей тады ніхто не закрыўся — тлумачылі, улічвалі заўвагі і пажаданні, вырашалі праблемы. Усе разумелі, што гараджане на ўзводзе і трэба вырашаць пытанне, каб усім было камфортна. Дапамагаў Гомельаблтранс, яго філіял у Мазыры працаваў суткамі, вырашалі праблемы з аўтобусамі, з маршрутамі. І гэта вельмі каштоўна. Калі кіраўнікі ідуць насустрач людзям, а людзі з разуменнем ставяцца і бачаць, што іх праблемы вырашаюцца, — ад гэтага выйграюць усе.

Часта на прыёме грамадзяне падымаюць пытанні, якія датычацца не іх асабіста, а ўсіх навакольных. У Ельску жанчына звярнулася з праблемай па электразабеспячэнні. Падчас размовы таксама паскардзілася, што ў двары дома няма ніводнай лаўкі (быў рамонт дома, старыя ўбралі, а новыя не паставілі), расказала пра дрэва, галіны якога вельмі разрасліся і пры моцным ветры могуць зламацца, што небяспечна. Разам з кіраўніком камунальнага жыллёва-эксплуатацыйнага ўнітарнага прадпрыемства вырашылі ўсе тры пытанні за адзін дзень. І што адметна — жанчына прасіла не дзеля сябе, яна падумала пра камфорт і бяспеку суседзяў. Летась у Мазыры мужчына звярнуўся з ініцыятывай аб устаноўцы святлафора на ўчастку дарогі, дзе рух машын быў ускладнены. З дапамогай усіх зацікаўленых, мясцовай улады ўсталявалі святлафор, і праблема мазырскіх аўтамабілістаў вырашылася. Зноў жа, мужчына прыйшоў дзеля камфорту ўсяго горада, а не свайго асабістага.

***— Якія высновы для сябе зрабілі падчас аналізу гатоўнасці ўстаноў адукацыі да новага навучальнага года?***

— Я праехала шмат школ. З 1 верасня 2025 года пачалі дзейнічаць змены, унесеныя ў Кодэкс аб адукацыі Рэспублікі Беларусь. Важна было абмеркаваць іх з настаўнікамі, атрымаць зваротную сувязь. І вельмі рада таму, што няма праблем з кадрамі, усе маладыя спецыялісты на сваіх працоўных месцах. Ніхто не ставіў глабальных праблем. Трэба аддаць належнае высокай ступені падрыхтоўкі школ. Усе прыклалі максімум намаганняў, каб прывесці ў парадак, упрыгожыць прышкольную тэрыторыю. Губернатар Гомельскай вобласці нават прапанаваў правесці абласны конкурс па добраўпарадкаванні прылеглай тэрыторыі. Мне было па-чалавечы важна прыняць удзел у акцыі «Збяры партфель першакласніку» і павіншаваць выпускніка ДУА «Дзіцячы сад № 1 г. Ельска» Пугача Фёдара. У маленькага беларуса пачынаецца важны жыццёвы этап, і ён павінен адчуваць клопат не толькі бацькоў, але і дзяржавы.

Так, у вёсцы застаюцца школы з малой колькасцю вучняў. І гэта пытанне. Кожную такую школу мы стараемся захаваць, не закрываць. Людзі хочуць, каб вёска жыла, яны спадзяюцца, што будуць прыязджаць сем'і з дзецьмі. А маладыя сем'і з дзецьмі наўрад ці захочуць ехаць у вёску, дзе няма школы.

***— Ала Валер'еўна, улічваючы разнастайнасць пытанняў, якія знаходзяцца ў полі вашай увагі, падзяліцеся, калі ласка, у чым крыніца вашага натхнення на працу.***

— Я адчуваю непадробнае задавальненне, калі ў мяне атрымліваецца дапамагчы чалавеку. Гэта лепшая матывацыя і крыніца натхнення. Для мяне няма няважных пытанняў, вялікіх ці маленькіх праблем. Калі чалавек прыйшоў да мяне з пытаннем — значыць гэта важна. І калі чалавек пайшоў задаволены тым, што яму дапамаглі, — дзень пражыты недарэмна.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

**Фота з архіва Алы НАВУМЕНКА.**

*Поўны тэкст чытайце на сайце zviazda.by*


Мясцовае Самакіраванне. Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;

e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 03.04.2004. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 11 378. Нумар падпісаны ў 19.30 2 верасня 2025 года.

СКАЖЫЦЕ, ДОКТАР...

# НЕ ПАДДАЦЦА ЦІСКУ

## Як пазбегнуць гіпертэнзіі і што рабіць, калі лекі не дапамагаюць?

Павышаны ціск — частая прычына звароту да ўрача. Аднак за кароткі час прыёму доктар не заўсёды паспявае расказаць, як жыць з артэрыяльнай гіпертэнзіяй і якія асаблівасці ёсць у гэтай хваробы. Напрыклад, на яе пачатковым этапе, усяго толькі змяніўшы лад жыцця, можна цалкам пазбегнуць праблем з ціскам. Што для гэтага трэба рабіць, чаму тут так важныя фізічныя нагрузкі і якія з іх не падыходзяць, а таксама як быць, калі прызначаныя лекі не дапамагаюць, разбіраемся з загадчыкам раённага кардыялагічнага цэнтра 6-й Цэнтральнай раённай клінічнай паліклінікі Мінска Таццянай КУЗЬМІЧ.

***— Таццяна Мікалаеўна, як не дапусціць гіпертаніі?***

— Павышаны артэрыяльны ціск з'яўляецца сур'ёзным станам арганізма, які можа прывесці да розных небяспечных ускладненняў, калі не кантраляваць яго ўзровень. На сёння гіпертэнзія з'яўляецца адной з самых распаўсюджаных праблем сярод дарослых. Павышаны ціск на сценкі артэрый можа выклікаць іх пашкоджанні, што, у сваю чаргу, павялічвае рызыку ўзнікнення сардэчна-сасудзістых захворванняў, інфарктаў, інсультаў і іншых ускладненняў.

**Асноўныя фактары рызыкі развіцця гіпертэнзіі — няправільнае харчаванне, недастатковая фізічная актыўнасць, лішняя вага, стрэс, ужыванне алкаголю і нікаціну, а таксама генетычная схільнасць.**

Таму важна сачыць за сваім ладам жыцця, правільна харчавацца, займацца спортам, пазбягаць шкодных звычак і рэгулярна кантраляваць артэрыяльны ціск.

Для прафілактыкі гіпертэнзіі рэкамендуецца ўмеранае ўжыванне солі. У адным граме харчовай паваранай солі змяшчаецца 387 мг натрыю (амаль 40%). Пры празмерным спажыванні натрый прыводзіць да затрымкі вады ў арганізме і, як следства, да павышэння артэрыяльнага ціску. З кожнай солевай малекулай затрымліваецца мінімум 10 малекул вады. У выніку аб'ём крыві (і ў цэлым вадкасці) у сасудах і тканках пачынае павялічвацца, а нагрузка на сэрца — узрастаць.

Варта абмежаваць тлушчы. Пры спажыванні тлушчаў спецыяльнага прызначэння, такіх як маргарын, пальмаядравы і соевы алей, іншых замяняльнікаў малочнага тлушчу, павышаецца ўзровень халестэрыну, што ўскладняе хваробу. У сасудах утвараюцца атэрасклератычныя бляшкі, якія абцяжарваюць рух крыві. Чым менш прасвет сасуда, тым вышэйшая верагоднасць інсульту або гіпертанічнага крызу. Таксама неабходна знізіць спажыванне прадуктаў, якія павышаюць узровень халестэрыну: напрыклад, замяніць тлустае мяса марской рыбай. У рацыёне гіпертоніка абавязкова павінны быць агародніна і садавіна, трэба імкнуцца штодня з'ядаць 4-5 порцый гародніны і садавіны (1 порцыя = 100 грамаў).

Важна сачыць за фізічнымі нагрузкамі і выконваць практыкаванні для прафілактыкі гіпертаніі.

***— Дарэчы, ці можна займацца спортам людзям, якія пакутуюць ад высокага ціску?***

— Кожны ўрач скажа, што актыўны лад жыцця заўсёды карысны. Артэрыяльная гіпертэнзія і спартыўныя заняткі адназначна сумяшчальныя, але пры гэтым трэба ўдакладняць, якім менавіта відам спорту можна займацца. Заняткі павінны праходзіць пад наглядам, каб нагрузка не справакавала максімальна дапушчальнага павышэння артэрыяльнага ціску. У перыяд абвастрэння (крызавага цячэння) заняткі можна адмяніць. Гіпертонікам процілпаказаны сілавыя заняткі: нельга падымаць гіры, займацца падводным плаваннем, падымацца на горы, займацца



ўсімі відамі барацьбы, цяжкай атлетыкай.

Любая дзейнасць, якая павялічвае частату сардэчных скарачэнняў і дыхання, лічыцца аэробнай актыўнасцю. Гэта язда на веласіпедзе, падыманне па лесвіцы, танцы, работа ў садзе, бег трушком, плаванне, прагулкі пешшу. Усё пералічанае дапамагае кантраляваць павышаны артэрыяльны ціск, з'яўляецца важным фактарам для зніжэння вагі і халестэрыну, умацоўвае сэрца і памяншае ўзровень стрэсу. Таму варта старацца мець як мінімум 150 хвілін умеранай аэробнай актыўнасці або 75 хвілін актыўнай у тыдзень.

***— Як зразумець, што нагрузка не празмерная?***

— Нагрузка ўмеранай інтэнсіўнасці павялічвае частату сардэчных скарачэнняў, суправаджаецца адчуваннем цяпла і лёгкай задышкі, але дазваляе пры гэтым камфортна гутарыць з іншым чалавекам. Важна пачынаць трэніроўкі паступова і з невялікіх нагрузак. Пры пачатковых прыкметах артэрыяльнай гіпертэнзіі людзям маладога ўзросту можна дазволіць бег або хуткую хаду.

Пры выкананні фізічнай нагрузкі ўзровень артэрыяльнага ціску можа павялічвацца, таму важна кантраляваць яго да пачатку заняткаў і пасля заканчэння. У норме паказчыкі ціску вяртаюцца да зыходнага значэння ў межах 10 хвілін. Калі гэтага не адбываецца, неабходна зменшыць інтэнсіўнасць фізічных практыкаванняў.

***— Што рабіць, калі прызначаныя лекі не дапамагаюць?***

— Як правіла, у такой праблемы ёсць вытлумачальныя прычыны, якія паддаюцца карэкцыі. Невыкананне рэкамендацый урача — гэта галоўны фактар адсутнасці эфекту ад прэпаратаў. Калі правільна прызначаныя прэпараты прымаюцца не ў той час, не ў тым аб'ёме і не так, як трэба, яны не працуюць. Акрамя таго, сярод прычын — салёная ежа: вы можаце не саліць ежу зусім, але ўжываць утоеную соль у падліўках, каўбасных вырабах, паўфабрыкатах і фастфудзе, сыры, выпечцы і хлебе, гатовых стравах на вынас.

Павялічвацца і трымацца высокі сісталічны і дыясталічны ціск можа з-за злоўжывання кафеінзмяшчальнымі напоямі. Таксама, як з-за ўжывання алкаголю — эпізадычнага або рэгулярнага. Сярод прычын, якія нівеліруюць лячэбнае дзеянне лекаў, — атлусценне або набор вагі. Уплывае і наш настрой. Калі пацыент жыве ў пастаянным стрэсе, то нават самыя лепшыя таблеткі не прывядуць да зніжэння ціску. Уплывае і сіндром абструктыўнага апноэ сну — распаўсюджаная паталогія, звязаная з рэзкім памяншэннем або поўным прыпынкам дыхання падчас начнога адпачынку.

Часта да адсутнасці выніку ў лячэнні прыводзіць замена прэпаратаў у аптэцы. У большасці выпадкаў пасля «рэкамендацый у аптэцы» пацыенты вяртаюцца зноў да ўрача.

Акрамя таго, справа можа быць у тым, што лекі яшчэ не працуюць у «поўную сілу». Трэба разумець, што максімум дзеяння некаторых прэпаратаў развіваецца не адразу, а толькі праз 14—21-ы дзень прыёму. Трэба проста пачакаць. Здараецца, што няправільна падабраны дозы і кампаненты лячэння. Гэтае пытанне вырашаецца толькі ў кабінеце ўрача заменай схемы тэрапіі.

Ёсць і рэзістэнтная артэрыяльная гіпертэнзія, якая, нягледзячы на ўсе спробы дактароў і розныя падыходы, устойлівая да лячэння. Але такое бывае вельмі рэдка — менш, чым у 10% выпадкаў.

**Алена КРАВЕЦ.**


ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ юридическая компания

- Взыскание задолженности
- Проведение торгов
- Ликвидация
- Юридические услуги

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

| **Организатор электронного аукциона** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайты в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by | | |
|---|---|---|---|
| **Продавец** | ООО «СтартАпЭксперт», г. Минск, ул. Одоевского, д. 117, 6 этаж, пом. 20, к. 19 | | |
| **Предмет публичных торгов (электронного аукциона)** | | | |
| Лот № | Наименование | Начальная цена, бел. руб. с учетом НДС 20 % | Минимальная цена, бел. руб. с учетом НДС 20 % |
| 1 | Обрабатывающий центр с ЧПУ ROVER K1232 G-BI, инв. № 49018008 | 115 000,00 | 57 500,00 |
| 2 | Раскройный центр ЧПУ SEKTOR 470 K1 3800x3200, инв. № 49018007 | 110 000,00 | 55 000,00 |
| 3 | Станок автоматический односторонний кромко-облицовочный AKRON 1440, инв. № 49018006 | 95 000,00 | 47 500,00 |
| 4 | Полуавтоматический кромкооблицовочный станок для фигурных заготовок ECLIPS-VITAP, инв. № 256 | 55 000,00 | 27 500,00 |
| 5 | Сверлильный центр с ЧПУ SKIPPER 100-BIESS, инв. № 255 | 230 000,00 | 115 000,00 |
| 6 | Станок автоматический односторонний кромкооблицовочный IMA Novimat/Contour/I/G80/700/R3+ | 180 000,00 | 90 000,00 |

**Задаток:** 3 % от начальной цены предмета электронного аукциона. В белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа **– ООО «Индустрия Инноваций»**

**Шаг электронного аукциона** – 5 % от начальной цены лота (не изменяется в ходе торгов)

Условия участия и порядок проведения электронного аукциона размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной площадки ООО «Индустрия Инноваций» https://iintorgi.by

**Срок подписания договора купли-продажи – 10 (десять) рабочих дней** после электронного аукциона

**Условия оплаты предмета электронного аукциона – 20 (двадцать) рабочих дней** со дня заключения договора купли-продажи. **Переход права собственности** – после полной оплаты имущества

**Торги проводятся в соответствии с регламентом ООО «Индустрия Инноваций», размещенным по адресу: https://iintorgi.by**

Победитель электронного аукциона либо единственный участник, которому будет предложен для приобретения предмет электронного аукциона (претендент на покупку), обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить 3 % от конечной цены продажи лота в случае, если цена продажи лота будет составлять менее 100 000,00 бел. руб., 2 % от конечной цены продажи лота в случае, если цена продажи лота будет составлять более 100 000,00 бел. руб., но не менее 200,00 бел. руб., в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения публичных торгов (аукциона)

Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона)

**Дата и время проведения торгов (аукциона):** 03.10.2025, начало торгов: 10.00, окончание торгов: 16.00. Заявки на участие в электронном аукционе принимаются с 03.09.2025 с 09.00 по 02.10.2025 г. до 17.00. Электронные торги продлеваются на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания торгов

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-300-90-03, +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by** |



## ДОПОЛНЕНИЕ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ООО «РЕТОРСИЯ ТРЕЙД»,

*опубликованной в газете «Звязда» от 21.08.2025 г.,* по объекту «Строительство жилого района с объектами инженерно-транспортной инфраструктуры в районе д. Тарасово Ждановичского с/с Минского района Минской области».

**Жилой дом № 3 по ГП**

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, в жилом доме № 3 по генплану предлагаются:

**5 (пять)** однокомнатных квартир **площадью 34-35 кв. м,** стоимость 1 кв. м **от 5 151 до 5 503 белорусских рублей;**

**7 (семь)** однокомнатных квартир **площадью 40-44 кв. м,** стоимость 1 кв. м **от 5 000 до 5 351 белорусских рублей;**

**3 (три)** двухкомнатные квартиры **площадью 53-54 кв. м,** стоимость 1 кв. м **от 4 909 до 5 260 белорусских рублей;**

**12 (двенадцать)** двухкомнатных квартир **площадью 62-64 кв. м,** стоимость 1 кв. м **от 4 454 до 4 836 белорусских рублей;**

**3 (три)** двухкомнатные квартиры **площадью 81-82 кв. м,** стоимость 1 кв. м **от 4 303 до 4 654 белорусских рублей.**

В организации действует система регулирования стоимости, зависимая от площади, этажа и условий оплаты строящегося объекта.

Оплата производится в белорусских рублях. Указанные цены действуют до момента опубликования новой проектной декларации, дополнения или изменения к ней и при условии наличия квартир, предложенных для заключения по договорам создания объектов долевого строительства.

**Условия оплаты квартиры** – полная оплата цены договора в течение 3-7 календарных дней либо поэтапная оплата цены договора в соответствии с действующей в организации системой рассрочки платежей с даты регистрации договора в местном исполнительном распорядительном органе.

Ознакомиться с планировками квартир можно по предварительной записи в офисе продаж «Гранд Вилладж» по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 19, пом. 1567 по графику пн – пт с 09.00 до 19.00, сб, вс – выходные, либо на сайте grand-village.by.

Тел. офиса продаж +375 (29) 177-00-22.

Прием заявлений на участие в долевом строительстве будет осуществляться в порядке живой очереди с 9:00 04.09.2025 г.

УНП 691310944

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/оператор. Адрес ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | Унитарное предприятие «Брэйк хайдроликс». 220026, г. Минск, пр-т Партизанский, д. 95В, комн. 41Б, литер Б 4/К |

**Предмет электронных торгов**

| № лота | Наименование (модель), инв. № | Начальная цена (с НДС 20 %), руб. |
|---|---|---|
| **Местонахождение: г. Минск, ул. Лынькова, д. 123** | | |
| 1 | Угольный фильтр очистки воды AF-C-75A, инв. № 1076 | 1 200,00 |
| 2 | Обрабатывающий центр BEA 2, зав. № 41024, 1989 г. в., инв. № 717 | 8 400,00 |
| 3 | Обрабатывающий центр BEA 2, зав. № 41175, 1989 г. в., инв. № 716 | 8 400,00 |
| **Местонахождение: г. Минск, пр-т Партизанский, 95** | | |
| 4 | Инструменты в кол-ве 86 ед.: державки, хвостовики, держатели, оправка и пр. | 29 257,80 |
| 5 | Инструменты в кол-ве 48 ед.: развертки GUHRING, зенкер, долбяк и пр. | 6 364,92 |
| 6 | Инструменты в кол-ве 102 ед.: балансир, сверла | 26 170,20 |
| 7 | Фрезы в кол-ве 236 ед. | 47 775,96 |

*Полный перечень имущества размещен на сайте организатора торгов www.ipmtorgi.by

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов: 5 (пять) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **6–10 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 04.10.2025 г. с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **03.10.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 373 21 33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор. Адрес ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | СООО «Эквипмент Рент Инвестмент». 220026, г. Минск, пр-т Партизанский, дом 95В, комн. 27В, литер Б 4/к |

**Предмет электронных торгов**
**Местонахождение – г. Минск, ул. Лынькова, 123**

| № лота | Наименование (модель) | Начальная цена (с НДС 20 %), руб. |
|---|---|---|
| 1 | Автомат токарный 6-шпиндельный КА-107 1Б240П6К, 1970 г. в. | 4 200,00 |
| 2 | Автомат токарный 6-шпиндельный 1Б216-6К, (2 ед.), 1998 и 2003 г. в. | 8400,00 |
| 3 | Автомат токарный 6-шпиндельный 1Б240-6К, 1991 г. в. | 4 200,00 |
| 4 | Автомат токарный 8-шпиндельный 1А 240-8, 1971 г. в. (2 ед.) и 1977 г. в. (1 ед.) | 12 600,00 |
| 5 | Автомат токарный 8-шпиндельный 1Б240-8К, (2 ед.), 1990 и 2006 г. в. | 8 400,00 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов: 5 (пять) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **6–10 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 04.10.2025 г. с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:**
заявки на участие в электронных торгах принимаются по **03.10.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by.

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 373 21 33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |


ПРЫГОЖЫ ГОРАД

# СТАЛІЦА ПАТАНАЕ Ў ЗЕЛЕНІ



## Высаджваецца больш за 30 тысяч дрэў

Гарады «жывымі» самастойна не становяцца, гэта вынік працы многіх спецыялістаў па стварэнні новых рэкрэацыйных магчымасцяў. Па словах намесніка генеральнага дырэктара па добраўпарадкаванні і ўтрыманні аб'ектаў зялёнай гаспадаркі УП «Мінскзелянбуд» Кацярыны КАРОТКІНАЙ, нашы прадпрыемствы круглы год абслугоўваюць 158 сквераў, 28 бульвараў, 38 паркаў і лесапаркаў галоўнага мегаполіса краіны. Яна адзначыла, што ў іх падпарадкаванні знаходзіцца 10 паркаў, з іх чатыры — паркі культуры і адпачынку, якія абсталяваны атракцыёнамі. На гэтых тэрыторыях таксама вядзецца праца па змесце і замене атракцыёнаў на больш сучасныя і цікавыя. У горадзе дзейнічае 23 пляжы. Па словах эксперта, штогод праводзіцца комплекс мерапрыемстваў па добраўпарадкаванні тэрыторый: бягучае ўтрыманне, азеляненне і кветкавае афармленне. Высаджваецца больш як 30 тысяч дрэў і звыш 300 тысяч кустоў кожны год. Сёлета ў спрыяльны вясновы перыяд было пасаджана 24 тысячы дрэў і каля 130 тысяч кустоў.

### АКЦЭНТ — НА РУЖАХ





Больш пільная ўвага ўдзяляецца кветкаваму афармленню. «Штогод памяншаецца колькасць высадкі аднагадовых раслін, прыкладна — на 7—10 % у пяцігодку. Сёлета пасаджаны 1 мільён 350 тысяч аднагадовых раслін як у плоскасныя кветнікі, так і ў малыя архітэктурныя формы. У рамках 80-годдзя Перамогі былі абноўлены або створаны новыя кветнікі, гэтая ж работа праводзіцца і да Дня горада Мінска. На агароджах раздзяляльных палос магістраляў выстаўлена 21 тысяча скрынь з ампельнымі раслінамі. Пасля завяршэння вегетацыйнага перыяду плануецца высадзіць каля 34 тысяч хрызантэм, якія будуць упрыгожваць горад аж да канца лістапада», — патлумачыла Кацярына Кароткіна.

Асобна яна падкрэсліла, што наўзамен адналеткаў павялічваецца доля шматгадовых раслін. Сёлета плануецца высадзіць каля 100 тысяч кветак. Па стане на пачатак восені такіх раслін ужо больш за 35 тысяч. Асобны акцэнт зроблены на ружах: калі раней іх высаджвалася каля 15 тысяч у год, то сёлета плануецца вырасціць каля 50 тысяч гэтых цудоўных кветак.

У сталіцы праводзіцца актыўная работа па стварэнні новых зон адпачынку. «Штогод у кожным адміністрацыйным раёне ствараюцца не менш за дзве зоны адпачынку. Гэта цяжкадаступныя тэрыторыі, участкі ўздоўж водных роўнядзяў і зямлі, якія не падлягаюць забудове. Работы пачынаюцца зімой з расчысткі зараснікаў, ламачча, сухастойных дрэў. У далейшым ажыццяўляецца добраўпарадкаванне з пракладкай дарожак, пасадкай зялёных насаджэнняў і кветкавым афармленнем. На сённяшні дзень створана больш за 70 такіх зон, і яшчэ дзевяць будуць адкрыты да свята горада», — паведаміла Кацярына Кароткіна.

### ЯК ЗАЦУГЛІЦЬ «ДРАКОНА»?

У кожнага маладога жыхара Мінска парк асацыіруецца з зонай адпачынку і разнастайнымі забавамі, і асаблівае слова — за атракцыёнамі. Сёння ў сталічных парках праводзіцца планамерная работа па абнаўленні атракцыёнаў. Пра гэта паведаміў **намеснік генеральнага дырэктара — галоўны інжынер УП «Мінскзелянбуд» Руслан КАСЕВІЧ**.

Усяго на балансе «Мінскзелянбуду» 59 атракцыёнаў. У Цэнтральным дзіцячым парку імя Горкага іх размяшчаецца 26, у парку імя Чалюскінцаў — 14, у парку імя Уга Чавеса — 11, і дзевяць у парку 900-годдзя горада Мінска.

Як адзначыў Руслан Касевіч, прадпрыемства паслядоўна замяняе састарэлыя і адпрацаваныя механізмы. «Былі спісаныя два атракцыёны: «Лебедзі» ў парку імя Чалюскінцаў і «Вальс» у Цэнтральным дзіцячым парку імя Горкага. Закуплены шэраг новых атракцыёнаў: «Лебедзі» — у парку імя Чалюскінцаў, «Драконы» і «Вальс» беларускай вытворчасці — у Цэнтральны дзіцячы парк імя Горкага», — паведаміў намеснік дырэктара.

Паводле яго слоў, ужо ў верасні чакаецца пастаўка яшчэ двух атракцыёнаў. «Гэта «Мікс» — у парк імя Чалюскінцаў і «Пажарная каманда» ў Цэнтральны дзіцячы парк імя Горкага. Мы разлічваем, што ў верасні яны будуць пастаўлены і пачнуцца работы па іх мантажы», — удакладніў Руслан Касевіч. Ён падкрэсліў, што сезон работы такіх механізмаў сёлета працягнецца да канца верасня. «Далейшае рашэнне будзе прымацца ў залежнасці ад умоў надвор'я: альбо аб працягу сезоннай працы, альбо аб пераходзе ў рэжым кансервацыі», — лічыць кіраўнік.

Таксама вядзецца работа па закупцы новых атракцыёнаў на перспектыву. «Плануецца набыць яшчэ два атракцыёны — «Ладдзя» і «Матацыклы». Калі ўсё атрымаецца, іх пастаўка чакаецца ў пачатку наступнага года», — паведаміў ён.

Цяпер на балансе «Мінскзелянбуду» знаходзіцца большасць гарадскіх фантанаў — усяго 39 аб'ектаў. «Для іх абслугоўвання створаны спецыялізаваны ўчастак, работнікі якога выконваюць усе рэгламентныя работы. Традыцыйна сезон працы фантанаў завяршаецца ў апошнюю пятніцу верасня», — сказаў Руслан Касевіч.

### ХАКЕЙНАЯ КАРОБКА Ў ЛЮБОЕ НАДВОР'Е

Як паведаміў **першы намеснік генеральнага дырэктара УП «Мінскзелянбуд» Уладзімір ХМАРА**, сталічныя паркі ў найбліжэйшы час атрымаюць новыя спартыўныя аб'екты.

«Мы працягваем будаўніцтва новых паркаў і рэканструкцыю «пажылых». У мінулым годзе завершана трэцяя чарга будаўніцтва парку імя Уга Чавеса. Там устаноўлены атракцыёны, што робіць яго адной з зон прыцягнення ў Фрунзенскім раёне. Таксама летась завершана рэканструкцыя парку 50-годдзя Вялікага Кастрычніка», — адзначыў Уладзімір Хмара.

Ён дадаў, што будаўніцтва парку Народнага адзінства працягваецца і завяршэнне плануецца ў наступным годзе. «На сённяшні дзень заканчваецца добраўпарадкаванне тэрыторыі ў межах вуліцы Дружбы і вуліцы Ежы Гедройца. Узведзена новая пешаходная сувязь, устаноўлены камфортныя лесвічныя маршы з пандусамі, выканана асвятленне».

Асаблівая ўвага ўдзяляецца спартыўнай тэматыцы новай чаргі парку імя Уга Чавеса. «Будуць абсталяваны веладарожка, пляцоўкі для пляжнага футбола і валейбола, воркаўт-пляцоўка, дзіцячыя гульнявыя комплексы, лыжаролерная траса і хакейная каробка са штучным лёдам. Гэта дазволіць падоўжыць сезон спартыўных заняткаў незалежна ад умоў надвор'я», — сказаў Уладзімір Хмара.

**Сяргей КУРКАЧ.**



# МАСТАЦТВА МІРАЛЮБІВАГА КАМПРАМІСУ



## Чаму дыпламатычныя кансультацыі Беларусі вызначаюцца высокай унікальнасцю?

Наша краіна паглыблена ў канфлікт ва Украіне. Не ў частцы ўдзелу ў ім, а ва ўрэгуляванні. Няхай не гучна і зусім не заўсёды публічна, але пытанні дээскалацыі праз беларускае пасрэдніцтва падымаюцца. І вырашаецца шэраг гуманітарных праблем. Той жа абмен палоннымі. Наладжванне такіх кантактаў для вялікай дыпламатыі таксама валодае велізарным значэннем. Пакуль невядома, у якім фармаце і ў якім геаграфічным пункце можа прайсці гістарычны саміт па пачатку канчатковага ўрэгулявання канфлікту ва Украіне. Не будзем гадаць і выказваць здагадкі, наколькі вялікі шанц Мінска стаць перагаворнай пляцоўкай. Але ў кіраўніцтва нашай краіны ёсць вялікія кампетэнцыі і псіхалагічнае разуменне першапрычын супрацьстаяння, пра якія шмат і часта кажуць, але ці зразумелыя яны тым жа заходнім палітыкам або з іншых рэгіёнаў?! І дыпламатычныя кансультацыі Беларусі валодаюць высокай унікальнасцю.



Несумненна, цяпер шмат аналітычных структур займаюцца вывучэннем, аналізам расійска-ўкраінскіх адносін, каб спрагназаваць іх далейшае развіццё з пункту гледжання нармалізацыі. Ці хоць бы мірнага суіснавання дзвюх краін і народаў як задачу мінімум. Безумоўна, у ЗША і ЕС ёсць наймагутнейшыя аналітычныя інстытуты, укамплектаваныя прафесіяналамі высокага класа ў міжнароднай палітыцы. Іншае пытанне — ці маецца ў іх разуменне ў поўнай меры аб фармаце працэсаў, якія адбываюцца на прасторах так званай постсавецкай прасторы?

У гэтым ёсць сумненні. І шмат нюансаў. Аналітыкаў па Расіі, Украіне, Казахстане, Узбекістане і іншых рэспубліках вялікае мноства, у тым ліку і публічных. І яны, быццам бы, разбіраюцца дасканала і паглыблена ва ўсіх пытаннях нашага жыцця. Іншая справа, што нямала гэтых спецыялістаў, уласна кажучы, і ў нашых краінах калі і бывалі, то праездам. Таму ў іх высновах больш здагадак, чым аналізу. Нават на Захадзе адзначаюць: пасля «халоднай вайны» веды аб шостай частцы сушы значна знізіліся і звузіліся. «Імперыю зла», як ключавога ворага, вывучалі пад лупай і з усіх бакоў. І геніяльных аналітыкаў у частцы савецкай рэчаіснасці было дастаткова. Балазе на гэты кірунак, як прыярытэтны з пункту гледжання нацыянальнай бяспекі, вылучаліся велізарныя рэсурсы. Пасля заканчэння эпохі двухпалярнага свету рэальныя даследчыя работы былі згорнутыя. Папросту яны сталі непатрэбныя. І постсавецкія рэспублікі цікавілі геапалітыкаў з пункту гледжання некаторых вузкіх кірункаў (тыя ж энергарэсурсы), якія не давалі агульнай карціны.

Не самы высокі ўзровень супрацоўніцтва і з Беларуссю, і з Расіяй, і з іншымі рэспублікамі не зрабіў іх зразумелымі заходняму свету. Якое дачыненне выклікалі нашы краіны ў тых ці іншых палітыкаў — гэта асобнае пытанне. Праблема, як мне здаецца, у іншым: уласна кажучы, на якой фактурнай базе гэтыя пазіцыі фарміраваліся. Бо нярэдка звяртаюцца нават да паслуг міграцыйных дысідэнтаў, якія валодаюць сваімі, глыбока суб'ектыўнымі, поглядамі на рэчаіснасць. У гэтым, дарэчы, заключаюцца і памылкі для заходняй дыпламатыі і палітыкі ў ацэнцы сітуацыі, у тым ліку і ў рамках той жа санкцыйнай палітыкі. У гэтым выпадку, як гаворыцца, і дзякуй богу, што ў нашых апанентаў, фактычна антаганістаў, няма выразнага плана дзеянняў. Але гэтак жа сама еўрапейцы і амерыканцы пачынаюць прабуксоўваць і ў добрых справах, такіх як урэгуляванне канфліктаў.

У Беларусі ёсць глыбокая экспертыза па ўсіх працэсах, якія адбываюцца ў СНД. Па той простай прычыне, што мы ў іх глыбока ўцягнутыя, прычым уцягнутыя з пазітыўнага боку. І ў нас ёсць вопыт выбудоўвання ўзаемаадносін. Яны ў нас ёсць з усімі былымі савецкімі рэспублікамі. Не заўсёды яны складваюцца зусім ужо бясхмарна, часам здараюцца дыскурсы, вельмі вострыя і эмацыянальныя, але яны прадвызначаюць кампраміс, а не развіццё канфрантацыі. А складаных пытанняў вельмі шмат. І з глыбокімі гістарычнымі каранямі. Распад Расійскай імперыі сто гадоў таму, стварэнне на значнай часткі яе тэрыторыі СССР і потым знікненне яго — не такі ўжо і працяглы перыяд з пункту гледжання гісторыі. А раз'яднанне дзяржаў — вельмі балючы інцыдэнт, які суправаджаецца доўгімі і разнастайнымі эксцэсамі. І яны, на жаль, адбываюцца. Не тое, каб яны прадвызначаныя, але гістарычная дыялектыка паказвае на высокую іх верагоднасць.

І Беларусь усе гэтыя глыбінныя супярэчнасці разумее. І ўмее знаходзіць канструктыўны баланс. Нам удалося цалкам мірна і прадукцыйна суіснаваць побач з усімі нашымі суседзямі, з якімі падчас Саюза мы жылі ў адной прасторы (у тым ліку дэ-факта і з Польшчай), і з Кіевам, і з Варшавай, Вільнюсам, Рыгай, Масквой падтрымлівалі заўсёды добрасуседскія адносіны. Вядома, меліся супярэчнасці, але іх канструктыўна вырашалі. Так, сёння па еўрапейскім кірунку ёсць ахаладжэнне. Але яно не з'яўляецца непераадольным і ў цэлым не такім ужо татальным, улічваючы, што знаходзімся мы, практычна, у прыфрантавой зоне, калі называць рэчы сваімі імёнамі. І ў частцы ўкраінскага канфлікту Беларусь валодае, бадай, унікальнай экспертызай — і тэарэтычнай, і практычнай. І грэх міратворцам, якой бы яны не былі нацыянальнасці, гэтымі кампетэнцыямі не скарыстацца.



**Інтэлект ШТУЧНЫ**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

## ОАО «Н Холдинг» проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности ОАО «МПОВТ»

**Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Н Холдинг» по организации и проведению аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **ЛОТ № 1** | Капитальное строение с инв. № 500/С-30043, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Притыцкого, 62. Площадь: 4325,9 кв. м. Наименование: Административно-бытовой корпус № 4. Назначение: Здание административно-хозяйственное. Обременение: аренда.<br>Капитальное строения расположено на земельном участке с кадастровым номером 500000000006002786, площадью 9,1842 га, предоставленный ОАО «МПОВТ» на праве постоянного пользования (срок действия: не установлен). | | | | |
| **Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **6 963 134,44** | **Задаток, BYN** | **348 156,72** | **Шаг аукциона** | **5 %** |
| **ЛОТ № 2** | Капитальное строение с инв. № 500/С-26559, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Притыцкого, 62/20. Площадь: 32558,7 кв. м. Наименование: Административно-производственное здание Литер А» 4/КП. Назначение: Здание специализированное для производства электротехнического, электронного и (или) оптического оборудования. Обременение: аренда, ипотека. Продавец обязуется снять обременение ипотекой до момента государственной регистрации договора купли-продажи с покупателем.<br>Капитальное строение расположено на земельном участке с кадастровым номером 500000000006008961, площадью 2,7024 га, предоставленное ОАО «МПОВТ» на праве постоянного пользования (срок действия: не установлен).<br>На земельном участке установлены следующие ограничения: ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах линий связи и радиофикации, площадь 0,0734 га; ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадь 0,0155 га; ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений водоснабжения, площадь 0,6003 га; ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений канализации, площадь 0,1706 га.<br>Капитальное строение с инв. № 500/С-65039, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Притыцкого, 62/ 21. Площадь: 9,8 кв. м. Наименование: КПП. Назначение: Здание неустановленного назначения. Составные части и принадлежности: 1/д КПП, а-площадка, б-проезд, в-площадка, г-лестница, д-подпорная стена, е-подпорная стена, ж-ограждение, и-ворота распашные, к-ворота распашные, л-ворота распашные, м-ворота распашные, н-ворота распашные, п-ворота распашные, р-ворота распашные, с-бордюр 0,16.<br>Капитальное строение расположено на земельном участке с кадастровым номером 500000000006009415, площадью 0,4472 га, предоставленное ОАО «МПОВТ» на праве аренды (срок действия: по 30.09.2056).<br>На земельном участке установлены следующие ограничения: Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах линий связи и радиофикации, площадь 0,0004 га; Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадь 0,0300 га | | | | |
| **Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **28 542 425,76** | **Задаток, BYN** | **1 427 121,29** | **Шаг аукциона** | **5 %** |

| | |
|---|---|
| **Сведения о продавце, его местонахождение и контактные телефоны** | ОАО «МПОВТ»<br>Республика Беларусь, 220140, г. Минск, ул. Притыцкого, д. 62<br>Тел. +375 (17) 388 90 99. E-mail: mpovt@mpovt.by |
| **Сведения об организаторе аукциона** | ОАО «Н Холдинг»<br>220029, г. Минск, пр-т Машерова, 11, пом. 1.<br>Тел. 8044 550 75 70 (Тарас) |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **10 (десяти) рабочих дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона |
| **Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона** | Победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, в течение 5 (пяти) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона, а также в течение 3 (трех) рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона выплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 1 % от цены продажи предмета аукциона по лоту № 1, 0,5 % от цены продажи предмета аукциона по лоту № 2, на основании счета, выставленного организатором аукциона |
| **Условия оплаты** | Оплата задатка производится резидентами в белорусских рублях (нерезидентами – в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты) на следующие банковские реквизиты: р/с BY79 AKBB 3012 0000 1634 1000 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, 220005, г. Минск, пр-т Независимости, 56. Получатель – Открытое акционерное общество «Н Холдинг», УНН 101059240, ОКПО 37392696.<br>Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за объект, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона |
| **Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе** | Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются п**о 25 сентября 2025 включительно** в рабочие дни с 9.00 до 16.55 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35-1 |
| **Место, дата и время проведения аукциона** | Аукцион состоится **26 сентября 2025 года** в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, 35-1, зал совещаний ОАО «Н Холдинг» |

Организатор аукциона после опубликования извещения о его проведении вправе в любое время, без объяснения причин, но не позднее чем за 3 календарных дня до даты проведения аукциона, указанной в извещении о проведении аукциона, отказаться от проведения аукциона

# УСЛЕД ЗА БРАТАМ

## Чаму хлопцы адной сям'і выбіраюць Спецыялізаваны ліцэй МУС



**Ужо дзясяты год запар учарашнія школьнікі з усёй краіны напаўняюць сваімі звонкімі галасамі сцены ведамаснай установы адукацыі, якая на працяглы час становіцца для іх альма-матар, домам, пляцоўкай для рэалізацыі спартыўных і творчых магчымасцяў і, вядома, пуцёўкай у дарослае жыццё. Не сакрэт, што Спецыялізаваны ліцэй МУС карыстаецца папулярнасцю ў юных жыхароў Беларусі, якія мараць аб афіцэрскіх пагонах.**

Працэнт паступлення выхаванцаў установы ў сілавыя ВНУ краіны традыцыйна высокі. Сёлета з 45 выпускнікоў 39 ліцэістаў паступілі ў Акадэмію МУС, пяцёра папоўнілі курсанцкія шэрагі Ваеннай акадэміі, адзін малады чалавек у інтарэсах міліцэйскага ведамства будзе вучыцца ў БНТУ. Усяго за 10 гадоў існавання ліцэя падрыхтавана звыш 2 тысяч сапраўдных патрыётаў, большасць з якіх нясе службу ў розных ведамствах ва ўсіх рэгіёнах краіны. Сёлета вялікую сям'ю ліцэістаў папоўнілі 50 сямікласнікаў, якія разам са старэйшымі таварышамі будуць пастулова рухацца да сваёй мары.

### УПОР НА ВУЧОБУ І ФІЗІЧНУЮ ПАДРЫХТОЎКУ

Для родных братоў Ягора і Мацвея Крывульцаў арыенцірам стаў іх старэйшы брат, які вучыўся ў ведамаснай установе. Першым па яго шляху пайшоў Ягор, затым паступіў у ліцэй і Мацвей. Як кажуць браты, настала чарга самага малодшага члена шматдзетнай сям'і. Тым больш што сямігадовы Гардзей ужо даўно вызначыўся са сваім прафесійным выбарам.

Ягор перайшоў на пяты курс, Мацвей працягне вучобу ў ліцэі на трэцім. Напярэдадні новага навучальнага года браты Крывульцы распавялі аб асаблівасцях вучобы і побыту ў ліцэі, падзяліліся планамі на будучыню.

Найперш — пра тое, з чаго ўсё пачалося. Хутчэй, з каго. «Мы на той момант жылі ў вёсцы Сянкевічы Лунінецкага раёна, калі старэйшы брат Міша паступіў у Спецыялізаваны ліцэй МУС, — расказвае Ягор. — Калі ён прыязджаў дадому ў форме, я захапляўся ім: такі прыгожы, мужны, моцны. Вырашыў таксама паступаць у ліцэй. Паколькі не вельмі добра вучыўся ў школе, пачаў падцягваць вучобу, больш актыўна займацца фізічнай падрыхтоўкай».

У выніку ў 2021 годзе Ягор Крывулец папоўніў шэрагі выхаванцаў ведамаснай установы. Праз два гады ў ліцэй паступіў і малодшы Мацвей. Для таго каб сыны маглі часцей бываць дома (а гэта магчыма толькі пры добрай вучобе), бацькі пераехалі ў аграгарадок Сеніца, што побач са сталіцай.

«Пасля таго як пабываў у ліцэі, на першым званку Ягора зразумеў, што гэта тое месца, дзе павінен вучыцца малады чалавек, які марыць аб добрай будучыні, хоча стаць ваеннаслужачым або абаронцам правапарадку», — кажа Мацвей.

### СТЫМУЛ ДОБРАЙ ВУЧОБЫ

Дарэчы, у Спецыялізаваны ліцэй МУС можна паступіць пасля шостага класа. Пры наяўнасці свабодных месцаў прымаюць у ведамасную ўстанову і пасля сёмага, восьмага, дзявятага класаў. Набор у 11 класы не ажыццяўляецца нават пры наяўнасці вакантных месцаў: асвоіць спецыфіку навучальнай установы за адзін год немагчыма.

Пры паступленні здаюцца экзамены па матэматыцы і мове (рускай ці беларускай). У абавязковым парадку абітурыенты праходзяць сур'ёзную медыцынскую камісію і псіхалагічнае тэсціраванне. Каб навучацца ў ліцэі, трэба мець добрую спартыўную падрыхтоўку, але пры паступленні фізічныя даныя не правяраюць. Удасканаліць спартыўныя навыкі выхаванцам хопіць часу: фізкультура ў ліцэі выкладаецца не тры разы на тыдзень як у звычайнай школе, а чатыры. Акрамя таго, наладжана ўзаемадзеянне са спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школай алімпійскага рэзерву Партызанскага раёна сталіцы, на базе якой ліцэісты займаюцца боксам, настольным тэнісам, барацьбой, іншымі відамі спорту. Браты Крывульцы, напрыклад, наведваюць секцыю па хакеі і футболе.

«Калі хочаш, каб цябе адпускалі ў звальненні, дрэнна вучыцца не будзеш, — заўважаюць Ягор і Мацвей. — Жаданне сустрэцца на выхадных з роднымі — найлепшы стымул атрымліваць добрыя ацэнкі».

### РАЗАМ ЛЯГЧЭЙ

Што датычыцца адаптацыі маладых людзей да іншага ўкладу жыцця, у кожнага яна праходзіць па-рознаму. Адным дастаткова і тыдня, каб прызвычаіцца да новага распарадку дня, іншым — крыху больш. Прафесійная матывацыя, уласцівая ўсім выхаванцам, пераважае, а таму ўсе цяжкасці, якія ўзнікаюць на першапачатковым этапе, пераадольваюцца проста.

Братам Крывульцам у гэтым плане пашанцавала. «Па першым часе я вельмі сумаваў па бацьках, — расказвае Мацвей. — Але калі разумееш, што на верхнім паверсе знаходзіцца твой брат, становіцца лягчэй, бо гэты шлях мы праходзім разам. Калі Ягор паступіць у ВНУ, мне яго будзе не хапаць. Аднак доўга сумаваць не атрымаецца, бо ліцэй — гэта адна вялікая сям'я, якая падтрымае ў любой сітуацыі».

Ні дня не праходзіць, каб браты не сустрэліся. Бачацца яны паміж урокамі, падчас спартыўных мерапрыемстваў на вуліцы. Вечарам збіраюцца ў адным з пакояў і гутараць на розныя тэмы, разам тэлефануюць бацькам. Дарэчы, як ні дзіўна, але малодшы Мацвей нярэдка дапамагае старэйшаму з урокамі, асабліва калі тэмы паўтараюцца. Ягор жа адказвае брату своечасовымі і важнымі парадамі. Па-за сценамі ліцэя яны таксама найлепшыя сябры. Нават кампанія ў іх — адна на дваіх.

З першага курса Ягор Крывулец — камандзір аддзялення. У зоне яго адказнасці — сямёра аднакласнікаў. У выпадку неабходнасці дапамагае ім з урокамі, кантралюе, ці забяспечаны парадак у пакоях, дзе хлопцы жывуць.

Сочыць за іх форменным абмундзіраваннем, для кожнага з'яўляецца сябрам, з якім можна пагутарыць ці звярнуцца за парадай. Па розных пытаннях Ягор нярэдка раіцца са сваім старэйшым братам, які ўжо служыць у воінскай часці 3214. Дарэчы, ёсць у хлопцаў яшчэ і сястра, якая таксама носіць пагоны: дзяўчына — баец атрада спецыяльнага прызначэння «Беркут» унутраных войскаў МУС Беларусі. Па іх шляху мяркуюць пайсці і Ягор з Мацвеем.

Бацькі ганарацца сваімі дзецьмі, якія вырашылі прысвяціць жыццё служэнню Радзіме. «Кожныя выхадныя мы прыязджаем дадому, — расказваюць хлопцы. — Дапамагаем маці з прыборкай, закупляем патрэбныя на тыдзень прадукты, выконваем іншыя яе даручэнні. Свае абавязкі ёсць ужо і ў самага малодшага брата».

Як адзначаюць выкладчыкі ліцэя, за пяць гадоў, праведзеных у навучальнай установе, хлопцы кардынальна мяняюцца. Яны становяцца самастойнымі, адказнымі, гатовымі прыйсці адзін аднаму на дапамогу. У сілавых ВНУ, дзе маладыя людзі працягваюць навучанне, заўважаюць, што выпускнікі ліцэя МУС на галаву вышэйшыя за ўчарашніх школьнікаў: і ў вучобе, і ў фізічнай падрыхтоўцы. Ды і прызвычайвацца да строгага распарадку дня і дысцыпліны ім ужо не трэба. Яны ўпэўнена крочаць да сваёй мары — служыць краіне і яе народу.

**Вераніка КАНЮТА.**

**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**


## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

### по объекту «Строительство жилого района с объектами инженерно-транспортной инфраструктуры в районе д. Тарасово Ждановичского с/с Минского района Минской области».

### Жилой дом № 2 по ГП

**Застройщик:** Общество с ограниченной ответственностью «Реторсия Трейд» зарегистрировано Минским горисполкомом 01.10.2010 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 691310944.

Местонахождение: Республика Беларусь, 220069, г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 19, пом. 1510 (кабинет 2). Тел. +375 (29) 177-00-22.

Режим работы по вопросам долевого строительства: понедельник – пятница с 09.00 до 19.00, выходные дни – суббота, воскресенье. Тел. +375 (29) 177-00-22.

**Реализованные проекты:** нет.

**Информация о проекте:**

**Цель строительства** – строительство «Строительство жилого района с объектами инженерно-транспортной инфраструктуры в районе д. Тарасово Ждановичского с/с Минского района Минской области».

Срок реализации проекта – 36 месяцев.

Ориентировочный срок ввода дома № 2 по ГП – 1 квартал 2027 г.

**Застройщиком получены:**

- решение Минского районного исполнительного комитета № 987 от 04.11.2021 г. о предоставлении земельного участка;
- решение Минского районного исполнительного комитета № 9698 от 02.09.2024 о разрешении на строительство;
- решение Минского районного исполнительного комитета № 1559 от 17.02.2025 о разрешении на строительство;
- свидетельство (удостоверения) о государственной регистрации земельного участка и возникновении права на него № 600/1854-1202 от 11.10.2021 площадью 8,2293 га;
- свидетельство (удостоверения) о государственной регистрации земельного участка и возникновении права на него № 600/182-14261 от 06.12.2021 площадью 7,7247 га;
- заключение государственной экспертизы № 874-15/24 от 22.01.2025 (положительное);

заключение государственной экспертизы № 690-15/23 от 29.09.2023 (положительное);

- извещение о получении уведомления о производстве строительно-монтажных работ и регистрации объекта строительства органами государственного строительного надзора № 1-111Ж-187/25 от 18.04.2025;
- договор строительного подряда № 02/04-25-2 от 02.04.2025;
- извещение о получении уведомления о производстве строительно-монтажных работ и регистрации объекта строительства органами государственного строительного надзора № 1-111И-592/24 от 09.09.2024.

**Информация об объекте:**

Жилая застройка расположена в границах районе д.Тарасово Ждановичского с/с Минского района Минской области, расположенной с запада от г. Минска за минской кольцевой автомобильной дорогой, ограничена с юга – существующей магистралью М6, с севера – существующей застройкой, с запада – существующей улицей Центральной, с востока – территорией пахотных земель. На территории жилого района предполагается размещение жилых зданий имеющих различную этажность 2–7 этажей, многофункционального центра, двух встроенных детских садов, двух паркингов, а также размещение зданий и сооружений инженерного назначения: КНС, КТПБ, РТПБ, ШРП, котельной, очистных сооружений дождевых стоков.

Проектом благоустройства жилого района предусматривается обустройство набережной и русла р. Качинка, устройство шумозащитного экрана, устройство ограждения жилого района, оборудование системами видеонаблюдения и доступа на территорию.

Обустройство дворовых территорий предусматривается комплексное на группу жилых домов, велопарковки и велобоксы, детские игровые площадки, спортивные площадки, малые архитектурные формы. Проектом озеленения предусмотрена посадка декоративных деревьев и кустарников, устройство газона.

Многоквартирный жилой дом № 2 по генеральному плану запроектирован 3-секционным, 6-7-этажным, с техподпольем и плоской рулонной кровлей. В доме запроектированы 80 квартир общей площадью от 61 до 82 кв. м.

Наружные стены здания из блоков ячеистого бетона, из монолитного железобетона со сплошным утеплением минераловатными плитами, внутренние стены – из монолитного железобетона, перегородки – из блоков ячеистого бетона, кирпичные; перегородки межквартирные – сдвоенные из блоков ячеистого бетона с заполнением зазора минераловатными плитами.

В квартирах выполнена штукатурка стен, цементно-песчаная стяжка, розетка для электроплиты, установка унитаза в с/у, установка оптической розетки.

Система отопления квартир – двухтрубная горизонтальная с поквартирным учётом тепла. Радиаторы отопления – стальные панельные со встроенным терморегулирующим клапаном и нижним подключением.

Оконные блоки – ПВХ-профиль, заполнение – двухкамерные стеклопакеты, оборудованы детскими замками безопасности, в окнах с пониженной подоконной частью глухое заполнение из многослойного безопасного стекла на высоту не менее 1,1 м от пола. Дверные блоки – деревянные. Остекление балконов – профиль ПВХ, оборудованы детскими замками безопасности, нижняя часть глухая из многослойного безопасного стекла на высоту не менее 1,1 м от пола. В каждой секции запроектирован 1 лифт, кабина проходная.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности после ввода в эксплуатацию жилого дома и передачи дольщикам объектов долевого строительства, входят: помещения инженерного назначения; межквартирные тамбуры, лестничные клетки, лифтовые холлы, вестибюли, колясочные, помещения уличного и уборочного инвентаря, лифты, конструкции дома, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, элементы внутридомовой инженерной инфраструктуры, объекты инженерно-транспортной инфраструктуры и благоустройства жилого района.

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, в жилом доме № 2 по генплану предлагаются:

**10 (десять)** двухкомнатных квартир **площадью 62–64 кв. м,** стоимость 1 кв. метра **от 4 454 до 4 836 белорусских рублей;**

**10 (десять)** двухкомнатных квартир **площадью 81–82 кв. м,** стоимость 1 кв. метра **от 4 303 до 4 654 белорусских рублей.**

В организации действует система регулирования стоимости, зависимая от площади, этажа и условий оплаты строящегося объекта.

Оплата производится в белорусских рублях. Указанные цены действуют до момента опубликования новой проектной декларации, дополнения или изменения к ней и при условии наличия квартир, предложенных для заключения по договорам создания объектов долевого строительства.

**Условия оплаты квартиры** – полная оплата цены договора в течение 3–7 календарных дней либо поэтапная оплата цены договора в соответствии с действующей в организации системой рассрочки платежей с даты регистрации договора в местном исполнительном распорядительном органе.

Ознакомиться с планировками квартир можно по предварительной записи в офисе продаж «Гранд Вилладж» по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 19, пом. 1567 по графику пн–пт с 09.00 до 19.00, сб, вс – выходные либо на сайте grand-village.by.

Тел. офиса продаж +375 (29) 177-00-22.

Прием заявлений на участие в долевом строительстве будет осуществляться в порядке живой очереди с 9.00 11.09.2025 г.

# «ЗОРНАЙ ХВАРОБЫ ЎДАЛОСЯ ПАЗБЕГНУЦЬ»

**Дэвіз бронзавага прызёра Алімпійскіх гульняў, шматразовага прызёра чэмпіянатаў свету Аліны ГАРНАСЬКО: «Калі нешта робіш, то рабі добра»**



Далікатная знешнасць і пяшчотны голас заслужанага майстра спорту Беларусі Аліны Гарнасько могуць лёгка падмануць чалавека, не знаёмага з яе біяграфіяй. Насамрэч ранімая жаноцкасць у ёй выдатна спалучаецца з жалезнай воляй і выключна моцным характарам. Без іх Аліна Гарнасько дакладна не ўпісала б сваё імя ў гісторыю мастацкай гімнастыкі.

## ДА ПЫТАННЯ АБ ШАНЦАВАННІ

***— Сёння ваша імя ведаюць прыхільнікі мастацкай гімнастыкі не толькі ў Беларусі, але і ў многіх краінах свету. Раскажыце, як пачынаўся ваш спартыўны старт? Хто прывёў вас у мастацкую гімнастыку, разгледзеў здольнасці?***

— З дзяцінства я была вельмі актыўная, шустрая, і ў тры гады бацькі вырашылі аддаць мяне ў спорт. Я трапіла да маладога трэнера — Ірыны Аляксандраўны Старасвецкай-Нехарошкавай. Яна ўлюбіла мяне ў мастацкую гімнастыку, пераканала ў тым, што я здольная, перспектыўная і магу разлічваць на поспех. Першыя ўдалыя выступленні і медалі падагрэлі мае амбіцыі.

***— Часам чуеш аб тым, як жорстка абыходзяцца трэнеры са сваімі выхаванцамі, рыхтуючы іх да спартыўных бітваў. Вы не сутыкаліся з падобным стаўленнем?***

— На шчасце, не. Мая гісторыя якраз пра іншае. У 10 гадоў я трапіла да алімпійскай чэмпіёнкі, заслужанага майстра спорту СССР Марыны Лобач. Калі яна пазнаёмілася з маімі бацькамі, то выказала пажаданне, каб усе пытанні, якія датычацца трэніровак, я вырашала з ёй самастойна. Бацькі цалкам давяралі Марыне Вікенцьеўне і не ўмешваліся ў нашы адносіны. Я сама адпрошвалася з заняткаў, расказвала пра свае недамаганні, вучылася размаўляць і чуць трэнера. За 14 гадоў Марына Вікенцьеўна стала для мяне родным чалавекам. Яна праводзіць са мной у зале больш часу, чым са сваёй сям'ёй дома. Дзіўлюся яе дабрыні і цярплівасці. З маім няпростым характарам велізарнае шанцаванне — выхоўвацца ў такой спартсменкі і асобы.

***— Але не заўсёды ж трэнер была вамі, напэўна, задаволеная? Як гэта праяўлялася?***

— Можна па пальцах пералічыць сітуацыі, калі Марына Вікенцьеўна назвала мяне па прозвішчы. Гэта калі ўжо я вельмі «пастаралася»! Апошнія гады на трэніроўках я — Аліна Аляксандраўна! Гэта ўзровень! *(смяецца)*



## ЦАНА ПЕРАМОГ

***— У вашай біяграфіі была «чорная паласа», калі траўма ішла за траўмай. Што дапамагло ў той сітуацыі выдужаць і працягнуць свой шлях да спартыўных вяршынь?***

— Так, 2018 год аказаўся вельмі складаным. На той момант у мяне не было выдатных вынікаў, але я ўжо добра ведала, чаго хачу і што магу. Наогул, прафесійны спорт — гэта пра амбіцыі і сілу волі, апантанасць і дысцыпліну. Не ведаю, як паступіла б сёння, у 24 гады. У 17 гадоў яшчэ не вельмі разумела сур'ёзнасць траўм, затое хацела рэалізаваць свае мары. Гэта стала вялізным стымулам для аднаўлення. Да таго ж побач аказаліся дарослыя, якія падтрымлівалі, пераконвалі ў тым, што мае перамогі яшчэ наперадзе. Любоў да мастацкай гімнастыкі дапамагла пераадолець выпрабаванні. Мусіць, мне трэба было зрабіць паўзу, каб потым апынуцца ў патрэбным час у патрэбным месцы.

***— Алімпіяда — самы стрэсавы, складаны старт. Там сустракаюцца наймацнейшыя спартсмены свету. У вас было прадчуванне поспеху на Алімпіядзе ў Токіа?***

— Не. Хоць перад той Алімпіядай я некалькі гадоў жыла думкай пра яе, праяўляла максімум дысцыпліны і самааддачы, але мы ехалі ў Токіа за годнымі выступамі, не разлічваючы на медалі. Алімпіяда ў 2021 годзе ў Токіа праходзіла ва ўмовах ковіда: пры пустых трыбунах, у цішыні. Перад намі з Анастасіяй Салас выступалі больш вопытныя, больш тытулаваныя спартсменкі. І калі я стала бронзавым прызёрам... Не перадаць словамі, якую буру эмоцый перажыла! Непаўторныя імгненні!

***— А якія выступы даліся вам па-сапраўднаму цяжка, сталі для вас выклікам?***

— У маі 2024 года я ўдзельнічала ў клубным чэмпіянаце Францыі ў Шамберы. І вось у дзень спаборніцтваў даведваюся аб рашэнні Міжнароднай федэрацыі мастацкай гімнастыкі (FIG) не дапускаць мяне да выступленняў на Алімпіядзе-2024 у Парыжы, пра якія неверагодна марыла. Гэта быў сапраўдны ўдар! Але я павінна выйсці і, нягледзячы на «разруху» ўнутры, падарыць публіцы свята. І я трымаю ўдар: з поўнай аддачай выконваю праграму. Не ўпэўнена, ці гледачы ведалі аб прынятым рашэнні FIG, ці ім проста спадабалася маё выступленне, але такой падтрымкі не адчувала ніколі раней. Многія апладзіравалі стоячы. І ўсё ж гэта быў драматычны для мяне дзень! Эмацыянальна цяжкімі аказаліся выступленні на міжнародным турніры ў ААЭ у 2022 годзе. Напярэдадні ад'езду памёр мой дзядуля Міша. Ён нарадзіўся 9 мая 1945 года, быў выдатным чалавекам, і я яго вельмі любіла. На суткі змагла затрымацца дома. Не хацелася нікуды ляцець. Але ёсць слова «трэба». Нягледзячы на свой стан здолела сабрацца і заваявала некалькі медалёў.

***— Гэта здольнасць узяць сябе ў рукі, мабілізавацца ў вас ад прыроды або вынік шматгадовай працы над сабой?***

— Гэта, безумоўна, прыходзіць з вопытам. За 20 гадоў у мастацкай гімнастыцы здаралася рознае, і я ўжо ведаю, які прыём лепш за ўсё спрацуе. Напрыклад, перад выступленнем люблю абняцца з трэнерам, гэта супакойвае. Часта чую ад навакольных: «На тваім твары цяжка нешта прачытаць». Гэта таксама выхоўвалася гадамі. Я вельмі эмацыянальная, але стараюся не паказваць свае пачуцці. Ніколі не апраўдваюся, што дрэнна выступіла з-за нейкіх аб'ектыўных складанасцяў, стану здароўя.

***— І ўсё ж на вашых вачах бываюць слёзы. Ці толькі ад радасці перамог?***

— Слёзы — гэта частка жыцця. Я ўсё ж дзяўчынка... Пусціць слязу ў канцы фінальнага практыкавання — для мяне наогул ужо добрая традыцыя. Слёзы радасці, шчасця я не хаваю. Але здараюцца і слёзы стомленасці, крыўды, засмучэння. Іх імкнуся хаваць. У такія хвіліны звычайна хачу пабыць адной.

## АБ МЕДНЫХ ТРУБАХ

***— Лічыцца, што выпрабаванне меднымі трубамі, славай — самае цяжкае. Ці знаёмая вам зорная хвароба?***

— Я пазбегла яе дзякуючы асяроддзю. Ні бацькі, ні трэнер не падтрымалі б такія паводзіны. І яны маюць рацыю: колькі б медалёў у цябе не было, колькі б ты не зарабляла, трэба заставацца чалавекам і не ўключаць зорку. Узнагароды, званні — гэта выдатна. Але я прыходжу ў залу — і я такая ж, як усе, трэба зноў працаваць, ісці далей. Пасля Алімпіяды я аддала свой медаль у музей Нацыянальнага алімпійскага камітэта. Яго наведвае шмат дзяцей, і я падумала: раптам кагосьці мая ўзнагарода натхніць на дасягненне сваіх спартыўных перамог.

**Вольга ПАКЛОНСКАЯ.**
**Фота з архіва Аліны ГАРНАСЬКО.**
**Поўны варыянт інтэрв'ю чытайце на сайце**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ

**Организатор электронных торгов:** Свислочский сельский исполнительный комитет, Минский обл., Пуховичский р-н, п. Дружный, ул. Парковая, 10, тел.: (801713) 52344, 52384.
**Оператор электронной торговой площадки:** открытое акционерное общество «Белорусская универсальная товарная биржа»
**Электронный адрес электронной торговой площадки:** www.et.butb.by. Дата проведения электронных торгов: **8 октября 2025 года**
**Время проведения электронных торгов** устанавливается ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество»

| № п/п | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка (га) | Наличие инженерных сетей | Расходы по подготовке документации (рублей) | Начальная цена (рублей) | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **г.п. Свислочь, ул. Полевая, У-206, 624455900001001027** | 0,1428 | Газоснабжение, водоснабжение и электроснабжение, водоотведение | 2357,02 + публикация в СМИ | 32 000,00 | 3 200,00 |

**Задаток** для участия в электронных торгах перечисляется на текущий (расчетный) счет № BY60AKBB30120000066940000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код AKBBBY2X, УНП 190542056, получатель платежа – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».

**Срок внесения задатка –** до подачи заявления на участие в электронных торгах. **Назначение платежа:** внесение суммы задатка на участие в торгах.

**Окончание приема заявлений на участие в электронных торгах** с прилагаемыми к ним документами – **03 октября 2025 года до 15.00.**

Лицо, желающее принять участие в электронных торгах в отношении нескольких предметов электронных торгов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из этих предметов. Оплата стоимости предметов торгов осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.

Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время либо с участием представителя организатора в рабочее время (понедельник–пятница, 8.30–13.00, 14.00–17.30).

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608 и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» от 29.12.2015 № 143.

Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; в течение 10 рабочих дней внести плату за земельный участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона; в течение двух месяцев со дня утверждения протокола о результатах аукциона обратиться в Марьиногорское бюро республиканского унитарного предприятия «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за государственной регистрацией земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него; получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство жилого дома; занять (освоить) земельный участок не позднее одного года после получения утвержденной проектной документации на строительство жилого дома.

Затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов **подлежат возмещению** в порядке, предусмотренном в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г. № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».

НАПЯРЭДАДНІ

# ТЭАТРАЛЬНАЕ МАСТАЦТВА БЕЗ МЕЖ

## Што можна знайсці ў праграме «Белай вежы»?

З 5 па 12 верасня ў Брэсце збярэ сваіх прыхільнікаў XXIX Міжнародны тэатральны фестываль «Белая вежа». Маштабнае мерапрыемства за гады існавання стала адным з брэндаў рэгіёна.
І сёлета на форуме рыхтуюцца здзіўляць гледачоў насычанай праграмай, у якой 30 спектакляў з шасці краін.

Арганізатарамі «Белай вежы» выступаюць Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Брэсцкі аблвыканкам і Брэсцкі акадэмічны тэатр драмы. Праходзіць фестываль пры фінансавай падтрымцы Міждзяржаўнага фонду гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц краін СНД. У чарговы раз ён аб'яднае таленавітыя тэатральныя калектывы з розных краін свету, каб прадэманстраваць усім прысутным, што тэатр і ў наш час застаецца жывым, дынамічным і актуальным мастацтвам.

У працэсе прафесійнага адбору экспертны савет сфарміраваў праграму, у якую ўвайшлі тры дзясяткі спектакляў ад калектываў з Беларусі, Арменіі, Казахстана, Кыргызстана, Расіі і Таджыкістана. Традыцыйна гледачы знойдуць у афішы і шырокі спектр жанраў, дзе ёсць класічная драма, інтэрактыўная камедыя, музычная казка. Заяўлены містычны трылер, электра-вулічны нуар, герагічны эпас і іншыя. Паказ спектакляў пройдзе на пяці мовах: беларускай, рускай, армянскай, татарскай і казахскай (пастаноўкі на замежнай мове будуць суправаджацца перакладам на рускую). Што да пляцовак, на якіх адбудуцца паказы, то іх таксама пяць: вялікая і малая залы Брэсцкага акадэмічнага тэатра драмы, фае тэатра, Брэсцкі тэатр лялек і Брэсцкі абласны грамадска-культурны цэнтр.

Вядома, у 80-годдзе Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне асаблівае месца ў фестывальнай праграме займаюць пастаноўкі аб бессмяротным подзвігу народа, які цаной неймаверных пакут захаваў сваю незалежнасць. Так, 5 верасня адкрые форум дакументальная драма «Горкі хлеб» Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага (Беларусь). А 6 верасня гледачам пакажуць драму «Матроская цішыня» Разанскага дзяржаўнага ордэна «Знак Пашаны» абласнога тэатра драмы (Расія). Абдудзецца таксама паказ спектакля «Мацярынскае поле» ад Ніжнекамскага дзяржаўнага татарскага драматычнага тэатра імя Т. А. Міннулліна (Расія, Татарстан). Ваенную драму «А досвіткі тут ціхія...» Тэатральнага аб'яднання Рэспублікі Адыгея (Майскоп, Расія, Рэспубліка Адыгея) зможаце пабачыць 12 верасня. У выкананні Смаленскага абласнога тэатра лялек імя Д. М. Сваціільнікава (Расія) 7 верасня пройдзе паказ спектакля «Бах-Бах-Бах» для дзяцей малодшага школьнага ўзросту. Усяго ў праграме «Белай вежы» сёлета гледачам прапаноўваюць 19 пастановак у жанры драмы.

Наша краіна будзе прадстаўлена шэрагам пастановак беларускіх калектываў. Акрамя ўжо згаданага Горкаўскага тэатра сваю творчасць прадставяць Магілёўскі абласны драматычны тэатр у спектаклі «Ігракі», Гомельскі абласны драматычны тэатр з пастаноўкай «Шлюб па-італьянску», таксама ўбачым «Камедыю» Новага драматычнага тэатра з Мінска, «Моцарт і Сальеры» ад Брэсцкага акадэмічнага тэатра драмы, «Верабей і Анёл. Гісторыя сяброўства Эдзіт Піяф і Марлен Дзітрых» у выкананні Магілёўскага абласнога тэатра драмы і камедыі імя В. І. Дуніна-Марцінкевіча.

Прыхільнікам лялечных спектакляў варта звярнуць увагу на расійскія паста-




ноўкі «Байкі Крылова» Стаўрапольскага краявога тэатра, «Гуляем у Алонха» ад Тэатра лялек Рэспублікі Саха, «Па шчупаковай волі» Маскоўскага дзіцячага тэатра марыянетак, «Каля Лукамор'я» Краснадарскага краявога тэатра лялек і «Канёк-гарбунок» Брэсцкага тэатра лялек (Беларусь). Яшчэ можна выбраць пастаноўку музычнага і музычна-пластычнага кірунку, які прадстаўлены музычнай драмай «Улпан» Казахскага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра для дзяцей і юнацтва імя Г. Мусрепава (Алматы, Казахстан), музычна-пластычным спектаклем «Казкі Пушкіна» Омскага абласнога тэатра юных гледачоў імя XX-годдзя Ленінскага камсамолу (Расія). У афішы форуму таксама ёсць і монаспектаклі. Словам, кожны адшукае тое, што яму бліжэй.

А 12 верасня ў вялікай зале Брэсцкага акадэмічнага тэатра драмы адбудзецца закрыццё фестывалю. «Белая вежа» развітаецца з гледачамі пасля паказу электра-вулічнага нуару па матывах аповесці Пушкіна «Капітанская дачка» ў выкананні Севярадзвінскага драматычнага тэатра.

**Алена ДРАПКО.**

# Надвор'е на заўтра

| | Ноч | Дзень |
|---|---|---|
| МІНСК 763 мм рт.сл. | +17..+18°C | +22..+25°C |
| ВІЦЕБСК 764 мм рт.сл. | +14..+16°C | +23..+25°C |
| МАГІЛЁЎ 764 мм рт.сл. | +13..+14°C | +24..+26°C |
| ГОМЕЛЬ 764 мм рт.сл. | +11..+14°C | +24..+25°C |
| ГРОДНА 762 мм рт.сл. | +17..+19°C | +22..+23°C |
| БРЭСТ 762 мм рт.сл. | +17..+19°C | +22..+24°C |

Паводле даных Белгідрамета

### ...у суседзяў

МАСКВА +19..+20°C

С.-ПЕЦЯРБУРГ +16..+17°C

### Месяц

*Першая чвэрць 31.08.–06.09. Месяц у сузор'і Стральца.*

### Геамагнітныя ўзрушэнні

22 гадз., 01 гадз., 04 гадз., 07 гадз., 10 гадз., 13 гадз., 16 гадз., 19 гадз.

Абазначэнні:
— няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў
— невялікія геамагнітныя ўзрушэнні
— слабая геамагнітная бура
— малая геамагнітная бура



Фота Лізаветы ГОЛАД.

## 3 ВЕРАСНЯ — Даты. Падзеі. Людзі

У краіне

**1915** год — нарадзіўся Барыс Іпалітавіч Райскі, беларускі дырыжор, заслужаны артыст Беларусі (1973). З 1957 г. галоўны дырыжор аркестра Мінскага цырка. У 1961—1988 гг. галоўны дырыжор і мастацкі кіраўнік канцэртна-эстраднага аркестра Беларускага тэлебачання і радыё. Аўтар аранжыровак для эстраднага і сімфанічнага аркестраў. Пад яго кіраўніцтвам зроблены фондавыя запісы опер «У пушчах Палесся» А. Багатырова, «Сівая легенда» Д. Смольскага, музычная камедыя Ю. Семянякі «Паўлінка», балеты і сімфанічныя творы Я. Глебава, песні І. Лучанка, Л. Захлеўнага і іншых кампазітараў.

**1930** год — нарадзіўся Юрый Фёдаравіч Патапаў, беларускі архітэктар, заслужаны архітэктар Беларусі (1985). У 1963—1973 гг. працаваў у інстытуце «Белдзяржпраект», з 1973 г. — галоўны архітэктар інстытута «БелНДІгіпрасельбуд», з 1980 г. — галоўны архітэктар інстытута «Белграмадзянпраект», з 1990 г. — кіраўнік творчай майстэрні. Асноўныя работы (усё ў суаўтарстве) — добраўпарадкаванне прывакзальнай плошчы, 16-павярховы атэль па вул. Савецкіх пагранічнікаў у Гродне, Мінскі лядовы палац спорту, мост праз Заходнюю Дзвіну і інш.

У свеце

**1880** — у Пецярбургу інжынер Фёдар Піроцкі прадэманстраваў першы ў Расіі (па некаторых звестках — першы ў свеце) электрычны трамвай. Інжынер яшчэ ў 1874 годзе пачаў праводзіць эксперыменты на Воўкавым полі і ў 1875 годзе на ўчастку Сестрарэцкай чыгункі запусціў вагоны на электрычнай цязе. А праз 6 гадоў Піроцкі мадэрнізаваў гарадскія двухпавярховыя трамваі на коннай цязе, пераведшы іх на электрычную.



**1905** год — нарадзіўся Карл Дэйвід Андэрсан, фізік, які адкрыў у 1932 годзе пазітрон, лаўрэат Нобелеўскай прэміі па фізіцы (1936).

# АЛЁ, НАРОД!..

ВЯСЁЛЫЯ І ЦІКАВЫЯ ГІСТОРЫІ АД ЧЫТАЧОЎ «ЗВЯЗДЫ»

Вядучая рубрыкі Валянціна ДОЎНАР.

## КВЕТКІ ДЛЯ ЖОНКІ

**Толік і Дзіма — не толькі суседзі, але і досыць блізкія сябры: на работу ходзяць разам, дамоў вяртаюцца ўдвух, па дарозе абмяркоўваюць розныя справы, іншы раз могуць збочыць на піва, а неяк — у кветкавы кіёск: Дзіма букет купіў.**

— У цешчы дзень нараджэння, — паведаміў сябру. — Трэба ж яе парадаваць... Дый жонка ласкавей на мяне паглядзіць...

— Хм-м, цікава, — азваўся Анатоль. — Ты пра цешчыны імяніны помніш, а я — не памятаю нават пра жончыны магу забыць... Далібог, не помню, калі ёй кветкі дарыў!

— Дык сёння купі... Проста так, — усхадзіўся Дзіма. — Калі грошай няма, я пазычу.

— Ды ёсць, толькі няёмка неяк, — прабубніў сябрук. — Адвык я ад гэтых цырымоній.

Але ж дастаў з кашалька грошы, купіў букет, з форсам данёс дадому — і ўжо ў кухні ўрачыста (наколькі змог) яго ўручыў.



Жонка ад нечаканасці аж мову страціла. Потым, калі голас прарэзаўся, насцярожана спытала:

— Што гэта?

— Як што? — усміхнуўся Анатоль. — Хіба не бачыш?.. Кветкі.

— Ды бачу... Але з чаго б? Хочаш нечага папрасіць?

— Не, ну што ты? — засмяяўся Анатоль. — Проста хацеў парадаваць.

— Парадаваць? — насцярожылася жонка. — А ў нас што, лішнія грошы з'явіліся?.. А-а-а, я ўсё зразумела: ты, мусіць, нешта адмачыў? І цяпер паддобрыцца хочаш? Прызнавайся!

— Дык няма ж у чым прызнавацца, — абурыўся Анатоль. — Тут звычайны сардэчны парыў.

— І да каго ж тваё сэрца рвалася? Нябось, да нейкай маладой лахудры? І што — хтосьці са знаёмых убачыў? Баішся, што «данясе»? Прызнавайся, негоднік! — не сунімалася жонка.

Мужу нічога не заставалася, як выскачыць за дзверы, мімаходам прыхапіўшы вядро са смеццем. Жонка заўсёды рада была, калі ён дапамагаў па гаспадарцы. Хоць па драбязе.

**Міхась СЛІВА,**
г. Рагачоў.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 11 378. Індэкс 63850. Зак. № 1954.

Нумар падпісаны ў 19.30 2 верасня 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12